КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №36 (164)
◂ 2 КАСТРЫЧНІКА ◂ 2009 г.

# Новы Час



**ЦЯПЕР Я ЦАЛКАМ НА СВАБОДЗЕ**

Стар. 6

**ВЫБІРАЦЬ ЦІ ЗАБАРАНЯЦЬ**

Правыя радыкальныя партыі прайгралі выбары ў Бундэстаг, аднак нямецкая грамадскасць патрабуе іх поўнай забароны

Стар. 5

**МІНСКАЯ ВОСЕНЬ ПАТРЫЯРХА**

Жнівеньскі 10-дзённы візіт Кірыла ва Украіну і вераснёўскі ў Беларусь адрозныя па характары

Стар. 14

**ТАНЯ МАЛЯРЧУК: «Я ПІШУ СЦІСЛА І СТРАШНА»**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Сын за бацьку...**

**Мастак Сяргей Вішнеўскі**

Нарыс Сяргея Гваздзёва з цыклу «Мастакі Віленскай школы»

▸ **РОЗДУМ**

# АДЗІН НАРОД ДЗВЮХ ДЗЯРЖАЎ

Вольга ХВОІН

**Еднасць геапалітычная і ментальная — паняцці далёка не тоесныя. Калі для першага дастаткова подпісаў некалькіх асобаў, надзеленых уладаю, то для другога патрэбны час, жаданне і адмысловыя ўмовы.**



Берлін. 20 год пасля падзення сцяны

На пачатку кастрычніка ў ФРГ адзначаюць нацыянальнае свята — Дзень германскага адзінства — у гонар паспяховага афіцыйнага ўз'яднання Заходняй і Усходняй Германіі 3 кастрычніка 1990 года. Берлінская сцяна падзяляла Германію ад 13 жніўня 1961 да 9 лістапада 1989 года, ператварыўшыся ў сімвал «халоднай вайны». Цяпер ужо сам Берлін стаў сімвалам аб'яднанай Еўропы.

Трансфармацыя нямецкай дзяржавы і нацыі напрыканцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў праходзіла пад лозунгам «Wir sind ein Volk!», што літаральна азначала «Мы — адзін народ!». Дваццаць гадоў таму самі немцы сфармулявалі сваё жаданне жыць у непадзельнай краіне. Іх памкненне, узгодненае кіруючымі вярхамі дзвюх вялікіх дзяржаў — СССР і ЗША, — увасобілася ў новыя контуры на палітычнай карце Еўропы. Аднак і цяпер немцы памятаюць, што ёсць Усходняя і Заходняя Германія.

Сацыялагічныя апытанні паказваюць, што каля 60 працэнтаў усходніх немцаў лічаць сябе абдзеленымі. Не складана пачуць і меркаванне, што жыхары былога ГДР адчуваюць сябе людзьмі другога гатунку. Заробкі ў заходніх землях Нямеччыны традыцыйна вышэйшыя. «Я неаднаразова сутыкалася з тым, што мне як жыхару Усходняй Германіі плацілі за такую ж працу на дваццаць





працэнтаў менш, чым маім калегам па былую лінію мяжы», — расказвае Ангела Крэллер, якая працуе экскурсаводам. Берлін Заходні — тэрыторыя элітных кварталаў, дарагіх крамаў, бізнес-цэнтраў. Усходні — чапляе вока постсавецкага жыхара знаёмымі сілуэтамі архітэктуры ў стылі канструктывісцкага мінімалізму. Усё ж дваццаць гадоў — занадта малы тэрмін, нават з улікам актыўнай інтэграцыйнай палітыкі, каб сцерці ментальны падзел. Нават у сённяшняй Беларусі праз семдзесят гадоў пасля яе аб'яднання, на ўсходзе краіны жыхароў Гродзеншчыны называюць «западэнцамі».

Дарэчы, «самая магутная жанчына ў свеце», паводле версіі амерыканскага часопіса «Forbes», канцлер Ангела Меркель вырасла ва Усходняй Германіі. Яна не адмаўляе таго факту, што ўсходнія немцы дагэтуль не дасягнулі ўзроўню жыцця жыхароў заходніх федэральных земляў. Кіраўніца Хрысціянска-дэмакратычнага саюза Германіі лічыць неабходным садзейнічаць эканамічнаму ўздыму ў новых федэральных землях, нармалізацыі сітуацыі на рынку працы, пераадоленню бюракратыі. Берлін накіроўвае ва ўсходнія землі буйныя сродкі на пераадоленне наступстваў у экалогіі і на эканамічнае развіццё. У гэтых мэтах з нямецкіх падаткаплацельшчыкаў спаганяюць «падатак на салідарнасць» у памеры 5,5 працэнта ад прыбыткаў.

Аднак большую папулярнасць, паводле нядаўніх сацыялагічных даследаванняў, спадарыня Меркель мае на Захадзе. Прычына ў такой расстаноўцы сімпатый, паводле спецыялістаў, — дагэтуль не раўназначная эканамічная сітуацыя ў рэгіёнах. Ад 1990 года ва ўсходнюю частку Германіі пераехалі многія прадпрыемствы. За 20 гадоў урад выдаткаваў больш 1,5 трыльёна еўра на развіццё і мадэрнізацыю эканомікі Усходняй Германіі. Аднак прадуктыўнасць «экс-камуністычнага» рэгіёна ўсё роўна складае ўсяго 25 працэнтаў ад паказчыкаў заходняй часткі краіны, што прымушае маладых немцаў пераязджаць з Усходняй Германіі ў яе заходнюю частку.

«Канцлер нямецкага адзінства» Гельмут Коль калісьці абяцаў усходнім немцам «квітнеючыя ландшафты» і задаволены аб'яднаннем народ пад сцягам ФРГ. Праўда, у сваіх мемуарах ён усё ж праяўляе шкадаванне ў сувязі з тым, што недааценіў адрэзак часу, які спатрэбіцца, каб выраўняць умовы жыцця людзей на Усходзе і на Захадзе ФРГ. Эксперты прагназуюць, што гэта адбудзецца толькі праз 30–40 гадоў. І, улічваючы настойлівасць, з якой цяперашняе кіраўніцтва Германіі імкнецца да запаветнай кропкі раўнавагі, аднойчы гэта адбудзецца. Акурат да таго часу да ўлады ў краіне прыйдуць цяперашнія маладыя немцы, для якіх падзеі канца мінулага стагоддзя — толькі эпізод з гісторыі. І цалкам верагодна, што, узгадваныя на палітыцы інтэграцыі, яны ўжо не ў маніфестацыйным запале, але з цвярозым асэнсаваннем змогуць сказаць «Wir sind ein Volk!».

**Колькасць насельніцтва ФРГ — больш за 80 млн. чалавек. Плошча — звыш 357 кв.км. Дзяржаўны гімн — «Песня аб Германіі», напісаная ў 1841 г. Генрыхам Хофманам фон Фалерслебенам на мелодыю Йозэфа Гайдна**

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЛЕЙКА. ЮБІЛЕЙ СУПОЛЬНАЙ ПРАЦЫ

За 15 гадоў у беларуска-германскім дзіцячым цэнтры «Надзея», які працуе ў Вілейцы, прайшлі аздараўленне больш за 40 тысяч дзяцей. Цэнтр створаны для аказання дапамогі дзецям, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы. За гады працы цэнтр значна пашырыў свае магчымасці і паралічыў прыём дзяцей з 60 чалавек у змену ў 1994 годзе да 280-ці ў 2009-м. На яго тэрыторыі, шмат у чым дзякуючы падтрымцы нямецкіх партнёраў, з'явіліся новыя будынкі, спартовыя пляцоўкі, гульнявыя комплексы. Акрамя прыёму дзяцей, якія стала пражываюць на тэрыторыях, забруджаных радыенуклідамі, цэнтр пры падтрымцы замежных і міжнародных дабрачынцаў рэгулярна праводзіць аздараўленне дзяцей з медыцынскімі паталогіямі (анкалагічныя захворванні, захворванні крыві, сэрца). Тут рэалізоўваюцца сацыяльныя праекты па аздараўленні дзяцей з няпоўных і шматдзетных сем'яў, праекты па арганізацыі сямейнага адпачынку для дзяцей-інвалідаў і іх бацькоў.

### КРЭВА. ФОТАПЛЕНЭР У ПРАВІНЦЫІ

Фотапленэр «Юрава гара–2009» пройдзе ў мястэчку Крэва 2–3 кастрычніка. Урачыстае адкрыццё пленэру распачнецца ў мясцовай кавярні «Уют» 2 кастрычніка ў 15 гадзін. Па выніках пленэру ў 2010 годзе ў Беларусі і краінах Еўропы пройдзе выстава, прымеркаваная да 625-годдзя з дня падпісання Крэўскай уніі. Прафесійныя фотамастакі з Беларусі прымуць удзел у далейшым стварэнні іміджу Крэва як гісторыка-культурнага цэнтра, цікавага для турыстаў з Беларусі і замежжа. Фатографы будуць працаваць у наступных намінацыях: архітэктура, пейзаж, рэпартаж, культура і традыцыі. Арганізатарамі фотапленэру «Юрава гара–2009» выступаюць Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Беларускае грамадскае аб'яднанне «Фотамастацтва», Смаргонскі райвыканкам. Фотапленэр адбудзецца пры падтрымцы кампаніі «Будзьма беларусамі!»

### ГРОДНА. У «ГАРАДЗЕНСКАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ» ПАПАЎНЕННЕ

Пабачыла свет кніга «Рыцары і дойліды Гародні». Яна выдадзеная за аўтарствам гарадзенскага гісторыка, доктара гістарычных навук Алеся Краўцэвіча і мастака Паўла Татарнікава. Выданне — 8-е у серыі «Гарадзенская Бібліятэка». Кніга распавядае пра гісторыю аднаго са старадаўніх гарадоў Беларусі. Выданне можна набыць у гродзенскай кнігарні «Кнігі» (Гарнавых, 7), а таксама ў Цэнтры Беларускай Кнігі (Будзёнага 48а — 44, памяшканне Таварыства беларускай школы), а таксама ў кнігарнях Мінску.

### ВІЛЕЙКА. ЛІТАРАТУРА ПРАВІНЦЫІ

Прэзентацыя адразу двух паэтычных альманахаў «Любы край дарагі» і «Вілейскі звон» адбылася 27 верасня ў мясцовым Доме культуры. У кнігах прадстаўлена творчасць сябраў літаратурнай суполкі «Натхненне» імя А. Гурыновіча, што існуе пры філіяле Вілейскай бібліятэкі. Кіруе суполкай, якая створаная больш за дваццаць год таму, Зінаіда Губарава-Крупская. Паэтэса нарадзілася ў Хойніцкім раёне, працуе настаўніцай фальклорнага танца ў гімназіі №2. Піша вершы, казкі, песні, байкі, выдала некалькі ўласных кніг. У паэтычных зборніках прадстаўленая творчасць Вольгі Ляжэвіч, Марыі Томкавіч, Надзеі Далёкай, Людмілы Адамовіч, Уладзіміра Бірылы, Міхаіла Пастарнака і іншых сябраў «Натхнення». У прэзентацыі ўзялі ўдзел літаратары і выдаўцы з Мінска.

### СМАРГОНЬ. СЛАВЯЦЬ КРАЙ

Выстава пад назвай «Пэндзлем, разцом і словам славім цябе, Смаргонь», адкрылася ў смаргонскім гісторыка-краязнаўчым музеі. У экспазіцыі, прысвечанай Году роднай зямлі, Смаргоншчына прадстаўлена ў творах землякоў — дзеячаў мастацтва і літаратуры. Скульптура Уладзіміра Цербуна, гравюра Напалеона Орды, вышыванка і гравюра Аляксандра Лося і Яўгеніі Ліс, разьба па дрэве Юрыя Маркава і Віталя Воранава, жывапіс Ніны Сосна, Юрыя Тумакова, Паўла Южыка, Канстанціна Высоцкага, Аляксандра Іванова, Валянціна Варанішчы, Ліліі Трохалевай, Уладзіміра Навіцкага, Анатоля Бляўскага, літаратурныя творы ўраджэнцаў і жыхароў Смаргоншчыны — усё гэта можна пабачыць у экспазіцыі.

## ЗАЯВА

# ЦІСК ЗМЕНШЫЎСЯ, ПРАБЛЕМАЎ ХАПАЕ

**Група міжнародных арганізацый, якія займаюцца пытаннямі СМІ і свабоды прэсы, прыняла па выніках візіту ў Беларусь адмысловую заяву.**




Сярод падпісантаў заявы — 14 ўплывовых міжнародных арганізацый, такіх, як «Рэпарцёры без межаў», «Міжнародны інстытут прэсы», Дацкі саюз журналістаў, «Article 19», Камітэт абароны журналістаў.

Арганізацыі, якія ўдзельнічалі ў місіі і падпісалі гэтую заяву, прадставяць поўную справаздачу ў якасці свайго ўнёску ў дыялог па правах чалавека паміж Еўрасаюзам і Беларуссю і распаўсюдзяць яе сярод іншых міжнародных арганізацый. Яны лічаць, што эканамічныя ўмовы для сродкаў масавай інфармацыі ў Беларусі не роўныя для ўсіх, «Саюздрук» і «Белпошта» абмяжоўваюць доступ да недзяржаўных выданняў і што працэдура выдзялення частотаў і ліцэнзій на вяшчанне непразрыстая і дазваляе розныя тлумачэнні, а гэта перашкаджае развіццю незалежнага і плюралістычнага вяшчання; доступ да інфармацыі абмежаваны, у прыватнасці, з-за прыняцця і прымянення законаў, якія абмяжоўваюць правы журналістаў на інфармацыю або ўсталёўваюць дыскрымінацыю ў дачыненні да недзяржаўных СМІ ў параўнанні з дзяржаўнымі ў доступе да інфармацыі, цікавай для грамадства.

Акрамя таго, група выпрацавала рэкамендацыі, скіраваныя на паляпшэнне і аздараўленне сітуацыі са сродкамі масавай інфармацыі ў Беларусі і для дзяржаўных, і для недзяржаўных СМІ, а таксама на павышэнне прафесіяналізму, плюралізму і ролі СМІ ў дэмакратычным грамадстве.

**Паводле інфармацыі БАЖ**

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ДЗЕНЬ ІНФАРМАВАННЯ Ў АЎТАЗАКУ

**Генадзь КЕСНЕР**

**30 верасня ў розных раёнах Мінска былі затрыманы актывісты Аб'яднаных дэмакратычных сіл, якія раздавалі людзям незалежныя друкаваныя выданні ў рамках Усеагульнага дня інфармавання, зладжанага Аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі.**

Сярод тых, хто апынуўся ў пастарунках, былі старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька і актывіст АГП Аляксандр Сцепаненка, першы сакратар Партыі камуністаў Беларускай Сяргей Калякін і сакратар ПКБ Валеры Ухналёў, а таксама карэспандэнт «НЧ».

Анатоля Лябедзьку і Аляксандра Сцепаненку затрымалі ў раёне Камароўскага рынку. Яны раздавалі мінакам асобнікі маланакладнай газеты «Глыток паветра». Пасля складання пратаколаў у пастарунку палітыкаў адпусцілі.

Я ж а 15-й гадзіне накіраваўся да прахадной Трактарнага завода, дзе першы сакратар ПКБ Сяргей Калякін павінен быў раздаваць спецвыпуск афіцыйна зарэгістраванай у Міністэрстве інфармацыі Беларусі газеты «Товарищ». Аднак працэс «раздачы» доўжыўся ўсяго некалькі хвілін. Да Калякіна падышлі некалькі асоб у цывільным і прапанавалі "прайсці для размовы"... у «аўтазак», прыпаркаваны непадалёк ад цэнтральнай прахадной МТЗ. Тым часам у кіроўцы Калякіна адабралі дакументы на машыну.

Праз колькі хвілінаў падышлі і да мяне з прапановай праследаваць "для высвятлення асобы". Довады, што я з'яўляюся журналістам зарэгістраванага ў Мініфарме выдання, сябрам ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (адпаведныя пасведчанні былі ў мяне), апроч таго, маю з сабой пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, на прадстаўнікоў улады не зрабілі ніякага ўражання. Давялося падпарадкавацца.

У «аўтазаку» Сяргей Калякін ужо праводзіў палітінфармацыю. Дзеля справядлівасці, мушу адзначыць, што тыя, хто нас затрымліваў, паводзілі сябе даволі цывілізавана, ветліва, а палітыка слухалі з непрыхаванай цікавасцю. Дарэчы, разам з намі ў «аўтазаку» на некалькі хвілін апынуліся яшчэ два маладых чалавекі волатаўскага целаскладу, якія на павер аказаліся ўсяго толькі «засланцамі» трактаразаводскага кіраўніцтва, якія мусілі назіраць, што адбываецца на плошчы перад завадской прахадной, і дакладаць міліцыянтам. Аднак так атрымалася, што на некаторы час яны самі апынуліся ў якасці затрыманых. «Кепская ў нас арганізацыя, паміж сабой дамовіцца не змаглі», — рэзюмаваў адзін з супрацоўнікаў праваахоўных органаў, адпускаючы на волю «наводчыкаў»-небаракаў. І праз паўзу з філасофскім задуменнем дадаў: «Ды і ў вас у апазіцыі не нашмат лепш».

Пасля гэтага нас з Сяргеем Калякіным адвезлі ў РУУС Партызанскага раёна Мінска, дзе развялі па розных кабінетах. Маральна я ўжо быў гатовы правесці ў пастарунку прадугледжаныя заканадаўствам на выпадак «высвятлення асобы» тры гадзіны. Але спрацавала маё тэлефанаванне ў БАЖ: праз колькі хвілін з кіраўніцтвам РУУСа звязаўся Андрэй Бастунец і дахадзіла патлумачыў, што я з'яўляюся не злачынцам ці правапарушальнікам, а ўсяго толькі выканаўцам сваіх прафесійных абавязкаў. У мене папрасілі прабачэння «за недарэчнае затрыманне» і адпусцілі на ўсе чатыры бакі.

## МЕДЫЯ

# ПРАЕКТ «34»

**Вечарына «34 Faces», прысвечаная беларускаму часопісу «34 MULTIMEDIA MAGAZINE», адбылася на мінулым тыдні ў галерэі «Ў», якая, дарэчы, павінна ўрачыста адчыніцца 7 кастрычніка.**

Імпрэзу наведалі прыхільнікі і сябры праекта, а таксама журналісты з маладзевых часопісаў «Muusa» (Эстонія), «Dummy» (Германія), «Chili» (Данія), «Aktivist» (Польшча) і «Uncle Mole» (Эстонія).

«Беларускі андэграўндны непалітычны мультымедыя-часопіс» (так называюць яго самі стваральнікі) можа стаць узорам для новых еўрапейскіх медыя. Дарэчы, журналісты, якія ствараюць падобныя праекты ў Еўропе, былі вельмі ўражаныя беларускім часопісам.

«Ідэя мультымедыя-часопіса вельмі прагрэсіўная і перспектыўная для журналістыкі. — лічыць Мэдс, журналіст з Даніі. — Часцяком, калі пішаш артыкул, думаеш, як добра было б далучыць да гэтага відэа, гук… Такія магчымасці дае выкарыстанне сродкаў мультымедыя, што немагчыма для папяровых выданняў. Хаця пераважная большасць часопісаў у Еўропе пакуль выходзіць на паперы».

«Мяркую, хутка сітуацыя з медыя зменіцца, — пагаджаецца з Мэдсам і працягвае разважанні Фабіян, журналіст з Берліна, які працуе для часопісаў «Dummy» і «Fluter». — І он-лайн медыя стане больш. А ідэя часопіса «34» — гэта вельмі здорава».

«Нам надзвычай даспадобы энтузіязм людзей, якія робяць гэты праект! — далучыліся да вышэйсказанага журналісткі варшаўскага гарадскога часопіса. — І мы спадзяемся на змены ў лепшы бок у вашай краіне».

**Паводле газеты «Салідарнасць», http://gazetaby.com**



## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЯК МЯДЗВЕДЗЕЎ ГРЫБЫ ШУКАЎ

*Сяргей САЛАЎЁЎ*

**Вось і адгрымелі сумесныя расійска-беларускія вучэнні «Захад–2009». Гэта былі самыя маштабныя вучэнні, як адзначае афіцыйная прэса. Больш за тое, гэтыя вучэнні былі не толькі расійска-беларускія, але і сумесныя ў межах АДКБ.**



Агульная колькасць войскаў, якія ўдзельнічалі ў АСВ, склала амаль 12,5 тыс. чалавек, у тым ліку ад Узброеных сіл, іншых войск і воінскіх фарміраванняў Беларусі — каля 6,5 тыс. чалавек, ад УС РФ — каля 6 тыс., ад УС Казахстана — каля 30 чалавек. Для ўдзелу ў вучэннях з запасу было прызвана каля 1,8 тыс. ваеннаабавязаных. У вучэннях была задзейнічана баявая і спецыяльная тэхніка, у тым ліку 103 лятальныя апараты (63 самалёты і 40 верталётаў), каля 470 баявых браніраваных машын, 228 танкаў, 234 самаходных і буксаваных артылерыйскіх гармат, мінамётаў і рэактыўных сістэм залпавага агню.

Галоўнае месца правядзення АСВ — Абуз-Лясноўскі палігон (Баранавіцкі раён, Брэсцкая вобласць), дзе 29 верасня адпрацоўваліся асноўныя мерапрыемствы практычных дзеянняў рэгіянальнай групоўкі. Асобна на Барысаўскім палігоне (Мінская вобласць) праводзіліся вучэнні па плане Генеральнага штаба Узброеных сіл РФ. Іх задума не звязана з задумай АСВ «Захад–2009». 19–29 верасня ў Беларусі таксама праводзіўся другі этап сумесных комплексных вучэнняў АДКБ. Яго тэма — «Арганізацыя прымянення воінскіх кантынгентаў узброеных сіл дзяржаў — членаў АДКБ ва Усходнееўрапейскім рэгіёне калектыўнай бяспекі». Падчас вучэнняў адпрацоўваліся пытанні ўдакладнення парадку разгортвання воінскіх кантынгентаў узброеных сіл дзяржаў — членаў АДКБ ва Усходнееўрапейскім рэгіёне калектыўнай бяспекі, аказання ваенна-палітычнай, ваеннай і ваенна-тэхнічнай дапамогі ў межах арганізацыі.

Як заўсёды, такія глабальныя акцыі не абышліся без кур'ёзаў. Калі Мядзведзеў прыбыў на палігон, ён найперш пацікавіўся ў губернатара Брэсцкай вобласці Канстанціна Сумара, якое зараз надвор'е. Сумар паведаміў Мядзведзеву, што ўчора было сонечна, але надвячоркам прайшлі дажджы, і дадаў, што такое надвор'е вельмі пасуе для таго, каб пайсці ў «ціхае паляванне» па грыбы. «Хадзем, пашукаем тады, можа, тут таксама ёсць», — сказаў Мядзведзеў. «Вашы байкоўцы і беларускія ўжо ўсе сабралі», — абламаў Мядзведзева Сумар.

Вось мы думалі, што глабальная гіпатэтычная вайсковая аперацыя ў выглядзе вучэнняў павінна абараніць рубяжы нашай «сінявокай». Некаторыя апазіцыянеры нават пабачылі пагрозу ў тым, што шмат расійскіх салдатаў наведалі Беларусь. Нібыта, гэта пагражае незалежнасці Беларусі, стварае небяспеку анексіі і гэтак далей. А тут — такі аблом. Аказваецца, што шэсць тысяч расійскіх вайскоўцаў разам з танкамі, авіяцыяй і іншай тэхнікай прыехалі ў Беларусь проста грыбочкі пазбіраць!

З іншага боку, някормлены салдат — дрэнны салдат. Няўжо ў расійскім і беларускім войску так дрэнна кормяць, што салдаты вымушаныя харчавацца верхавінкамі ды карэньчыкамі, для смаку дадаючы ў іх грыбы? Каб хоць не патруціліся выпадкова...

Перцу ў вучэнні дадаў таксама хлопчык Коля, які на вучэннях ад бацькі не адыходзіў. Мядзведзеў заўважыў, што хлопчык таксама ўзброены. Прычым ягоны пісталет быў залацістага колеру. Мядзведзеў пацікавіўся, ці падабаецца хлопчыку «валына». «Добры «ствол», бо яго прэзідэнт Расіі падараваў», — адказаў за Колю Аляксандр Рыгоравіч, і адзначыў, што пісталет яшчэ не зараджаны.

Цікава, а каб быў зараджаны? Можа, Коля знянацку б стрэліў у вока Мядзведзеву — во быў бы канфуз!

Але ўсё абышлося. Сумесная групоўка нагалаву разбіла «ўмоўнага праціўніка» і выйшла пераможцам з гіпатэтычнай вайнушкі. За разгром гіпатэтычнага ворага вайскоўцы атрымалі зусім не гіпатэтычныя ўзнагароды. Усе задаволеныя. Прэзідэнты нагуляліся ў салдацікі, вайскоўцы атрымалі зорачкі, Коля пацешыўся з «валынай», апазіцыянеры пагулялі з міліцыяй у «даганялкі», пратэстуючы супраць вучэнняў. Карацей, усе бавілі час з надзвычайнай карысцю і асалодай. Пра што сведчаць і словы Мядзведзева, сказаныя па заканчэнні мерапрыемства: «Мы з Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам дамовіліся, што такога кшталту вучэнні будуць праходзіць адзін раз на два гады папераменна на тэрыторыі Беларусі і Расійскай Федэрацыі. Так што гэта пачатак, і, спадзяюся, паспяховы пачатак, нашых сумесных вайсковых мерапрыемстваў».

Так што працяг будзе. І, можа, наступным разам усё ж пашанцуе Мядзведзеву з грыбамі.

Дарэчы, варта адзначыць, што «гульня ў салдацікі» — зусім не выпадковы выраз. Гэта менавіта гульня, бо ўсе шмат чаго чакалі ад сустрэчы Лукашэнкі і Мядзведзева. Прынамсі, чакаліся перамовы «сам-насам» і выхад да прэсы па іх выніках. Не адбылося ні таго, ні другога. Расійскі і беларускі кіраўнікі па заканчэнні вучэнняў селі ў свае самалёты-верталёты і разляцеліся ў розныя бакі.

А 29 верасня стала вядома, што на пасяджэнні савета Палаты прадстаўнікоў быў сфарміраваны праект парадку дня трэцяй сесіі, якая адкрыецца 2 кастрычніка. Пытанне пра прызнанне незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі ў яго не ўвайшло. «Я не думаю, што з гэтага трэба рабіць выснову пра тое, будзе разглядацца гэта пытанне на сесіі або не. Парадак дня можна дапаўняць на працягу ўсёй сесіі», — растлумачыў старшыня парламенцкай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Сяргей Маскевіч.

Дэпутат паведаміў, што гэта пытанне «яшчэ не разглядалася на пасяджэнні профільнай камісіі, а толькі ў рабочым парадку». Маскевіч таксама адзначыў, што ў дэпутатаў «няма сфармаванага падыходу, як рэагаваць на пытанне пра прызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі: станоўча, адмоўна або адкласці на больш позні тэрмін».

То бок, пакуль гэта пытанне па-ранейшаму застаецца прадметам гандлю паміж Мінскам і Масквой. Дадуць танны газ — прызнаем, не дадуць, — дык на «не» і прызнання няма.

З іншага боку, складанасці ў нас і з Еўропай. Еўракамісія пакуль не прыняла рашэнне па запыце беларускіх уладаў пра выдзяленне краіне макрафінансавай дапамогі, паведаміў кіраўнік прадстаўніцтва ЕК у Мінску Жан-Эрык Хольцапфель.

Дыпламат адзначыў, што дапамога будзе аказана, у прыватнасці, калі Беларусь выканае пагадненне з Міжнародным валютным фондам пра атрыманне крэдыту стэнд-бай, пры наяўнасці дэфіцыту фінансавання, а таксама наяўнасці ў ЕС фінансавай магчымасці выдзеліць такія сродкі.

Ну і бог з імі, грашыма. Грыбочкі ў нас ёсць, а ў астатнім — абы не было вайны.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### АЛЯКСЕЙ СІГАЕЎ

Мінскую гарадскую арганізацыю Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) узначаліў малады палітык — 29-гадовы Аляксей Сігаеў. Ён змяніў на гэтай пасадзе генерала Валерыя Фралова. Аляксей Сігаеў шмат гадоў з'яўляецца сябрам партыі. Быў адным з лідэраў маладзевай партыйнай арганізацыі. Апошнім часам узначальваў Фрунзенскую раённую арганізацыю горада Мінска і быў адначасова намеснікам старшыні гарадскога партыйнага камітэта. «У адпаведнасці са статутам я быў абраны прадстаўнікамі трох афіцыйна зарэгістраваных суполак. Астатнія маюць толькі дарадчае права. Гэта ўскладняе матывацыю да працы людзей з незарэгістраваных суполак. Таму апошнім часам былі толькі статутныя мерапрыемствы — сходы-сходы-сходы... Першыя месяцы я хачу актывізавацца ўнутры структуры, а пасля буду глядзець далей. Думаю, што на сённяшні момант нам трэба як развіваць палітструктуры, так і папулярызаваць іх у грамадстве», — падзяліўся планамі Аляксей Сігаеў. Генерал Аляксей Фралоў застаўся адным з намеснікаў кіраўніка БСДП (Грамада) Анатоля Ляўковіча.

### АЛЯКСАНДР КІКЕНЕЎ



Студэнт 4 курса юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта Аляксандр Кікенеў адзіны з беларускай каманды завяваў бронзавы медаль на чэмпіянаце свету па грэка-рымскай барацьбе ў вагавай катэгорыі да 74 кілаграмаў. Гэтыя спаборніцтвы праходзілі ў дацкім горадзе Хернінг з 23 па 27 верасня. Беларускую каманду прадстаўлялі сямёра спартоўцаў, з іх пяцёра — студэнты БДУ. Стартаваўшы з дзвюх перамог, у 1/4 фіналу Аляксандр Кікенеў саступіў турку Селчуку Чэбі (0:3, 0:2), які затым выйшаў у фінал і стаў чэмпіёнам свету. А наш суайчыннік атрымаў шанец пазмагацца за бронзу ў суцяшальным турніры. Спачатку Аляксандр перамог казахстанскага барца Асэта Адзілава (1:0, 8:0), а пасля прадстаўніка Германіі Канстанціна Шнайдэра (2:0, 1:0). Медаль Аляксандра Кікенева стаў адзіным для беларусаў у спаборніцтвах грэка-рымлян. У камандным заліку беларуская каманда грэка-рымлян заняла 12-е месца. У тройку мацнейшых увайшлі зборныя Турцыі, Ірана і Азербайджана. Усяго ў турніры выступалі прадстаўнікі 54 краін.



### ЗЯНОН ЛОМАЦЬ

Кіраўнік Камітэта дзяржкантролю Беларусі абвясціў вайну няякаснаму імпарту. Чыноўнік паабяцаў навесці парадак у пытаннях выдачы сертыфікатаў на імпартныя прадукты і на якасць тавараў, што пастаўляюцца ў краіну. «Мы імкнуліся акуратна падступіць да гэтай тэмы, каб не нашкодзіць. Але ў гэтай справе неабходна навесці належны парадак. І мы яго навядзем. Калі б нашы вытворцы-экспарцёры пастаўлялі за мяжу не адпаведную стандартам прадукцыю, яе б адразу там завярнулі, а ў нас можна», — перадае словы Зянона Ломатя інфармацыйнае агенцтва БЕЛТА. Ломаць паабяцаў зрабіць так, каб беларускія спажыўцы ведалі, якія прадукты яны купляюць. Для гэтага будзе «арганізаваны» асаблівы кантроль за этыкеткамі, іх змест мусіць прадстаўляць поўную інфармацыю аб прадукце. У выпадку, калі будуць выяўленыя несупадзенні, прадукцыя да пакупніка не дойдзе. «Мы цвёрда спытаем з тых, хто імпартуе ў краіну такія прадукты і выдае сертыфікаты, што дапускаюць гэтую прадукцыю на ўнутраны рынак», — падкрэсліў кіраўнік Дзяржкантролю. Ініцыятыву Ломаця падтрымаў і старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Беларусі Валер Карашкоў, заявіўшы, што больш за 30 працэнтаў імпартных прадуктаў не адпавядаюць нашаму заканадаўству і Дзяржстандарт адмаўляе ім у сертыфікацыі. У сувязі з новай тактыкай адносна імпарту сімптаматычна выглядаюць словы Зянона Ломаця пра тое, што ў Беларусі ў дастатковай колькасці выпускаецца прадукцыя айчынных вытворцаў, якая па якасці не саступае замежнай. Відаць, кіраўнік Дзяржкантролю далучыўся да PR-кампаніі пад назвай «Купляйце беларускае».

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ПАЛІТАЛОГІЯ РЭПЛІК

Сяргей НІКАЛЮК

**«Хто не ведае, у якую гавань плыве, таму не будзе спадарожнага ветру». Гэта выказванне Сенекі за дзве з лішнім тысячы гадоў не страціла свой актуальнасці не толькі для мараплаўцаў, але і для палітыкаў.**



## Рэплікі з месца

У канцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя сярод інтэлігенцыі была папулярная кніга «Фізікі жартуюць», у якой, у прыватнасці, даваліся парады, як рабіць уражанне на апанентаў падчас навуковых дыскусій. Самы просты спосаб, па меркаванні аўтара кнігі, — падаць рэпліку з месца. Уявіце сабе, што ідзе абмеркаванне даклада, прысвечанага праблеме ядзернага сінтэзу. Ці можна далучыцца да агульнай размовы, калі нічога ў гэтым самім сінтэзе не разумееш? Так, элементарна. Не ўстаючы з месца, вы кідаеце ў бок дакладчыка рэпліку. Напрыклад, такую: «Скажыце, а што на гэты конт думаюць нашы калегі англічане?»

А зараз у думках перанясемся ў памяшканне ўправы БНФ, дзе рэгулярна праводзяцца «круглыя сталы» з удзелам палітыкаў і палітолагаў. Задача палітыкаў — ставіць мэты, як найбліжэйшыя (тактычныя), так і аддаленыя (стратэгічныя). Задача палітолагаў — іх абгрунтоўваць. Зразумела, што абгрунтаванне павінна рабіцца не метадам «трох П» (падлога, плафон, палец), а абапірацца на вызначаныя тэарэтычныя ўяўленні і мадэлі.

Але гэта ў ідэале. У рэальнасці ж палітолагі жартуюць у нас не горш за фізікаў. Прынамсі, іх здольнасць абмяркоўваць палітычныя пытанні і даваць рэкамендацыі палітыкам выключна на мове рэплік вартая адначасова здзіўлення і захаплення. Так, з года ў год палітолагі рэкамендуюць палітыкам не абмяжоўвацца працай з патэнцыйнымі прыхільнікамі, якіх у апазіцыйных палітыкаў у беларускім грамадстве каля 30 працэнтаў, а імкнуцца «заваяваць большасць».

Калі такога кшталту прапанова сыходзіць ад шараговых партыйцаў, патрабаваць абгрунтоўваць яе бессэнсоўна. Не іх гэта справа. Але палітолагі абавязаныя спачатку хаця б прааналізаваць структуру беларускага электарату. Паказаць, як групы выбарцаў, вылучаныя паводле пэўных прыкметаў, галасавалі на мінулых выбарах і чаму яны так галасавалі. Далей варта растлумачыць, пад уплывам якіх аб'ектыўных або суб'ектыўных фактараў змянілася (або можа быць зменены) гэта самая структура. І толькі тады магчымы пераход да рэкамендацый, у тым ліку і да рэкамендацый па «заваёве большасці».

Да іншага вельмі распаўсюджанага віду паліталагічных рэплік варта аднесці абвінавачванні на адрас апазіцыі з нагоды яе няздольнасці перамагаць, якія паўтараюцца з зайздроснай рэгулярнасцю. Пры гэтым часта можна пачуць спасылкі на досвед краін, у якіх адбыліся «каляровыя» рэвалюцыі. Наша апазіцыя, маўляў, не здольна арганізаваць штосьці падобнага кшталту. І сапраўды, наша — не здольна. Таму што «каляровыя» рэвалюцыі — гэта, найперш, разборкі ўсярэдзіне праўладнай эліты. Самая вядомая «каляровая» рэвалюцыя — Перабудова. Працытую журналіста Паўла Шарамета: «Ну няўжо Савецкі Саюз скінулі дысідэнты і нясмелыя грамадзяне, якія ім спачувалі? Усё ляснулася, калі скончыліся грошы, і падпалкоўнік Пуцін дапамагаў дэмакрату Сабчаку руйнаваць тое, што павінен быў з апошніх сіл абараняць».

Павел Шарамет не палітолаг. Ён журналіст, але сутнасць Перабудовы абмаляваў дакладна. У сістэме, заснаванай на перамеркаванні рэсурсаў, узнікла сітуацыя, калі перарамеркоўваць не стала чаго, і тады ў палітычнай эліце пачаўся раскол. Падчас элітнага міжсабойчыку адна з яе частак на чале з Гарбачовым звярнулася за падтрымкай да народа. І пачалося...

## Справа за дробяззю

У дзяржавах аўтарытарных, у адрозненне ад дзяржаў дэмакратычных, пераможца атрымлівае ўсё. Таму не варта здзіўляцца, што рэсурсы паміж уладай і апазіцыяй у аўтарытарных дзяржавах размяркоўваюцца, мякка кажучы, непрапарцыйна. Але ёсць адно выключэнне: адміністратыўны рэсурс не здольны прыкметна паўплываць на размеркаванне інтэлекту. Менавіта таму ў апазіцыі ёсць патэнцыйны шанец пераўзысці сваіх апанентаў у кампетэнтнасці. Але гаворка ідзе менавіта пра шанец, якім неабходна яшчэ ўмець скарыстацца.

Вазьму на сябе адвагу сцвярджаць, што кампетэнтнасць як рэсурс пры поўных акалічнасцях здольная пераважыць усе іншыя рэсурсавыя кампаненты. У якасці абгрунтавання сваёй адвагі спашлюся на Аляксандра Грыцанава: «Выратаваць Беларусь можа толькі саюз кампетэнтнасці супраць некампетэнтнасці, а не саюз «дэмакратаў» і «патрыётаў», «лібералаў» і «дзяржаўнікаў», «саўкоў» і «нацдэмаў» адзін супраць аднаго».

Ці ёсць у апазіцыйных палітыкаў попыт на кампетэнтную аналітыку, і ці спараджае гэты попыт адпаведную прапанову? Звернемся да вынікаў апошняга кангрэса. На ім, калі чытачы яшчэ памятаюць, была прынятая стратэгія АДС. У якасці яе галоўнага элемента было вызначана «ініцыяванне свабодных (з выкананнем патрабаванняў АБСЕ) выбараў у Беларусі», а першым крокам на шляху да такіх выбараў павінен быў стаць «перамоўны працэс з удзелам дэмакратычных палітычных сіл і грамадскіх арганізацый Беларусі».

У якасці каментара — крыху азбучнай тэорыі. Паводле адназ з азначэнняў, аўтарытарныя рэжымы — гэта рэжымы, якія падаўжаюць сваё існаванне шляхам маніпуляцый выбарамі. Прапаноўваць падобнаму рэжыму правесці свабодныя выбары — усё роўна што прапанаваць яму самаліквідавацца. Гэта не значыць, што пытанне наконт правядзення свабодных выбараў не павінна ўздымацца апазіцыяй. Як адзін з элементаў прапаганды яго варта ўвесь час мусіраваць у СМІ, але такога кшталту медыйная актыўнасць не можа ляжаць у аснове стратэгіі апазіцыі.

Беларусь — не адзіная аўтарытарная дзяржава ў свеце, і спроба беларускай апазіцыі арганізаваць дыялог з уладай не з'яўляецца унікальнай. У паліталогіі такія рэжымы і такія спробы дастаткова падрабязна апісаныя. У прыватнасці, не з'яўляюцца сакрэтам умовы, пры якіх дыялог паміж аўтарытарнай уладай і апазіцыяй можа быць прадуктыўным. Дастаткова ўзгадаць прыклад Польшчы.

Але ці склаліся ў Беларусі аналагічныя ўмовы на момант прыняцця стратэгіі, і ці могуць яны скласціся ў перспектыве? Прычына паспяховасці польскага дыялогу ляжыць на паверхні. Яна ў наяўнасці за спінай апазіцыйных перагаворшчыкаў магутнага грамадскага руху ў асобе прафсаюзу «Салідарнасць». Справа, такім чынам, за дробяззю. Неабходна стварыць такі рух.





Мастачка Крысціна Сампая (Cristina Sampaio), Партугалія. Карыкатуры «Дэманстрацыя» і «Спіч»

## Хто разарве кола?

Ці можна разглядаць згаданую вышэй «дробязь» у якасці заяўкі на чарговую стратэгію? На паперы ўсё выглядае дастаткова прыгожа. Для пераносу гэтай прыгажосці ў жыццё бракуе толькі беларускага Валенсы. Але тут узнікае прычынна-следчая загвоздка. Хто каго спарадзіў: Валенса «Салідарнасць» або «Салідарнасць» Валенсу?

Немагчыма сфармаваць дзеяздольны грамадскі рух без пэўнага ўзроўню салідарнасці ў грамадстве. Сацыёлагі ў такім разе кажуць пра сацыяльны капітал. Пра тое, як ён "працуе" ў еўрапейскіх краінах, нам рэгулярна паказваюць па канале «Еўраньюс». Вось адзін толькі прыклад. Гадоў дзесяць таму ў Парыжы нейкія нягоднікі апаганілі габрэйскія пахаванні на могілках Пер-Ляшэз. На наступны дзень у сталіцы Францыі адбылася стыхійная дэманстрацыя пратэсту, у якой прынялі ўдзел каля двух мільёнаў чалавек.

Пратэстныя акцыі апазіцыі ў Мінску не настолькі шматлюдныя. У апошнія ж гады нават «Чарнобыльскіх Шлях» збірае добра калі пару тысяч удзельнікаў. Пасля чарговага правалу чарговай «масавай акцыі» ў адрас апазіцыі з боку палітолагаў выказваюцца прэтэнзіі (зразумела, афармленыя ў выглядзе рэплік) у няўменні арганізаваць такога кшталту мерапрыемствы. Маўляў, налепкі з заклікам прыйсці на Шлях былі безгустоўнымі па афармленні, і колькасць іх была недастатковая, да таго ж расклеілі іх занадта позна.

Арганізатары, натуральна, апраўдваюцца ды спасылаюцца пры гэтым на недахоп рэсурсаў. А вось ва ўлады праблем з рэсурсамі няма, дый колькасць яе прыхільнікаў мінімум у два разы вышэй, чым у апазіцыі. Аднак уявіць сабе прыхільнікаў улады, якія сабраліся па ўласнай ініцыятыве, каб выказаць сваю падтрымку «палітыцы партыі і ўраду», я не магу. Збор па ініцыятыве самой улады не лічыцца.

У майго добрага прыяцеля жонка працуе ў адной з мінскіх школ, размешчаных у цэнтры горада. За апошнія гады яна, мабыць, не прапусціла ні аднаго хакейнага матчу з удзелам каманды кіраўніка дзяржавы. Гэтак жа актыўна «хварэюць» і яе калегі па працы. Няцяжка здагадацца, што наведваюць хакейныя матчы педагогі не бескарысліва.

Эфектыўнасць такой палітычнай падтрымкі мы назіралі ў гады распаду СССР. Сёння дзесяткі мільёнаў былых савецкіх грамадзян льюць кракадзілавыя слёзы з нагоды «найвялікшай катастрофы XX стагоддзя», вось толькі дзе яны былі ў дні катастрофы?

У паліталогіі ёсць такое паняцце — «палітычны ўдзел», пад якім разумеюцца дзеянні любога чальца палітычнай сістэмы, накіраваныя на змену вынікаў яе дзейнасці. Ёсць масавы палітычны ўдзел — ёсць палітыка. А калі няма, то атрымліваецца, як у Беларусі, дзе нават чальцы ўрада палітыкамі не з'яўляюцца. Адсюль знакамітая рэпліка Лукашэнкі, кінутая на адрас свайго найбліжэйшага атачэння: «У Беларусі толькі адзін палітык! Гэта Я!»

Час падводзіць вынік, але перш чым гэта зрабіць, я не магу ў чарговы раз не працытаваць расійскага сацыёлага Льва Гудкова: «Калі мы не будзем разумець, адмовімся разумець, якім чынам грамадства падтрымлівае гэты рэжым, мы ўвесь час будзем апынацца ў замкнёным коле нашых уласных ілюзій і няўдач».

Адмаўленне разумець і ўсведамляць спараджае паліталогію рэплік, якая, у сваю чаргу, стварыць замкнёнае кола з рэплікамі палітыкаў. Так узнікае класічная праблема курыцы і яйка, і хто ў гэтай пары першасны — ужо, мабыць, і не разабраць.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# STOP 193–1

Марыя КРУК

**Асамблея недзяржаўных дэмакратычных арганізацый праводзіць кампанію «СТОП 193–1» за адмену артыкула 193–1 Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Гэты артыкул быў уведзены ў Крымінальны кодэкс Беларусі перад мінулымі прэзідэнцкімі выбарамі. З 2006 года, калі ўступіла ў дзеянне крымінальная адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый, па артыкуле 193–1 былі асуджаныя 17 чалавек. Апраўдальных прысудаў праваабаронцы не зафіксавалі.**

На дадзены момант улада адышла ад практыкі кропкавых пазітыўных зменаў у сферы свабоды асацыяцыяў, лібералізацыя адбываецца выключна на ўзроўні рыторыкі — такія высновы зрабілі эксперты Асамблеі НДА па выніках маніторынгу «Прававы стан няўрадавых арганізацый у 2009 годзе». Старшыня Асамблеі НДА Сяргей Мацкевіч зазначае, што апошнім часам назіраецца небяспечная тэндэнцыя, калі ўлады спрабуюць любыя змены выдаць за пазітыўныя.

Напрыклад, новая версія Закона «Аб грамадскіх арганізацыях» рыхтуецца без уліку меркавання грамадзянскага сектару. Прыняцце гэтага закона можа істотна пагоршыць сітуацыю са свабодай асацыяцый у краіне. «Пасля прыпынення санкцый ЕС у дачыненні да шэрагу беларускіх чыноўнікаў прайшло паўгода. Але ніводнае з прынцыповых для грамадзянскай супольнасці пытанняў не было вырашана ўладамі. Па-першае, дагэтуль не скасавана адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі па артыкуле 193–1 Крымінальнага кодэкса Беларусі. Па-другое, пытанне рэгістрацыі грамадскіх арганізацый па-ранейшаму застаецца праблемным. Па-трэцяе, ніякіх зрухаў па стварэнні льготных ставак арэнды памяшканняў для НДА таксама не заўважаецца», — рэзюмуе Сяргей Мацкевіч.




Прадстаўнікі Асамблеі НДА, аднак, не губляюць асцярожнага аптымізму адносна верагоднасці паляпшэння адносінаў паміж грамадзянскай супольнасцю і дзяржавай. Наладжванне канструктыўных узаемаадносінаў з дзяржаўнымі органамі магчымае пры выпрацоўцы супольнай з трэцім сектарам ідэйнай платформы. На думку сяброў Асамблеі НДА, такой платформай можа стаць «Канцэпцыя развіцця грамадзянскай супольнасці ў Беларусі». Аднак старшыня Беларускага Хельсінскага камітэта Алег Гулак лічыць, што распрацаваную Асамблеяй НДА канцэпцыю яшчэ рана называць базавым дакументам для наладжвання адносінаў паміж дзяржавай і трэцім сектарам. Аднак дасягненне пагадненняў, зафіксаваных у канцэпцыі, дапаможа і ўладам, і грамадзянскай супольнасці дасягнуць пэўнага ўзроўню паразумення, ад якога выйграе ўсё грамадства.

Раней Міністэрства юстыцыі пацвердзіла намер уладаў скасаваць артыкул 193–1 Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае адказнасць за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. Пра гэта паведамлялася ў лісце да Міжнароднага грамадскага аб’яднання «Грамадзянская Беларусь» (Чэхія), якое звярталася ў Мінюст з заклікам скасаваць названы артыкул. З адказу Міністэрства юстыцыі вынікае, што на дадзены момант кампетэнтнымі органамі вывучаецца пытанне ўнясення магчымых зменаў у нарматыўныя дакументы, што рэгулююць дзейнасць структур грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. У тым ліку аналізуюцца палажэнні, датычныя дзейнасці ад імя незарэгістраваных палітычных партый і іншых грамадскіх арганізацый.

У прыватнасці, у дакуменце гаворыцца: «На дадзеным этапе мяркуецца выключыць з артыкула 193–1 Крымінальнага кодэкса норму пра адказнасць за арганізацыю дзейнасці або ўдзел у дзейнасці палітычнай партыі, іншага грамадскага аб’яднання, рэлігійнай арганізацыі ці фонду, якія не прайшлі ва ўстаноўленым парадку дзяржаўную рэгістрацыю, замяніўшы крымінальную адказнасць за гэтыя дзеянні на адміністратыўную адказнасць».

Юрыст Юрый Чавусаў магчымы перагляд артыкула 193–1 Крымінальнага кодэкса лічыць пазітыўным, аднак недасканалым крокам. «Фармулёўкі ў лісце Міністэрства юстыцыі досыць неканкрэтныя. Справа ў тым, што магчымасць скасавання дадзенага адыёзнага крымінальнага артыкула толькі разглядаецца неназванымі органамі. Але той факт, што дзяржава ўпершыню прызнала наяўнасць праблемы і прыслухалася да меркавання шматлікіх крытыкаў аб ненармальнай прававой сітуацыі — ужо вялікае дасягненне. Зразумела, лепшым варыянтам было б поўнае скасаванне забароны на дзейнасць незарэгістраваных аб’яднанняў. Гэта наблізіла б Беларусь да еўрапейскіх стандартаў прававога рэгулявання грамадзянскай супольнасці. Аднак дзяржава абірае прамежкавы варыянт: дзейнасць незарэгістраваных аб’яднанняў перастане быць крымінальным злачынствам, але ўсё роўна застанецца незаконнай, застанецца адміністратыўным правапарушэннем», — адзначае юрыст.

У апошні дзень верасня Асамблея НДА арганізавала круглы стол «193–1: Крымінальны пераслед за дзейнасць незарэгістраваных арганізацый у Беларусі» ў Варшаве. Мерапрыемства адбылася ў межах штогадовай нарады АБСЕ па чалавечым вымярэнні. Дэлегацыю краінаў — сябраў АБСЕ азнаёмілі з практыкай выкарыстання артыкула 193–1 Крымінальнага кодэкса ў дачыненні да ўдзельнікаў незарэгістраваных няўрадавых арганізацый у 2006–2009 гадах. Апроч таго, эксперты Асамблеі НДА далі ацэнку дзеянням беларускіх уладаў па нармалізацыі становішча грамадскіх аб’яднанняў у кантэксце беларуска-еўрапейскага дыялогу.

КАМЕНТАР

# МІНЮСТ НЕ МОЖА НА НАС УПЛЫВАЦЬ

**Сярод шэрагу арганізацый, якія цяпер дзейнічаюць у Беларусі без рэгістрацыі — праваабарончы цэнтр «Вясна».**

Арганізацыя паўстала яшчэ ў 1996 годзе, у 1999-м была зарэгістраваная як Грамадскае аб’яднанне «Праваабарончы цэнтр «Вясна». Аднак рашэннем Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь 28 кастрычніка 2003 года за ўдзел у назіранні падчас прэзідэнцкіх выбараў 2001 года грамадскае аб’яднанне было пазбаўлена дзяржаўнай рэгістрацыі. Праваабаронцы тройчы спрабавалі вярнуцца ў прававое поле, штораз ім адмаўлялі. Як уплывае на дзейнасць праца ў фактычна нелегальным рэжыме, расказвае юрыст «Вясны» Уладзімір Лабковіч.

— Дзяржаўная рэгістрацыя моцна ўплывае на прававы статус арганізацый. Гэта запыты ў дзяржаўныя органы, дзейнасць, арганізацыя нейкіх мерапрыемстваў, узаемадачыненні з суб’ектамі гаспадарання. Падкрэслю, што сам факт наяўнасці артыкула 193–1 — вялікі ўдар па грамадзянскай супольнасці, моцны стрымліваючы фактар па стварэнню і дзейнасці няўрадавых арганізацый. За час дзеяння гэтага артыкула павялічылася колькасць зваротаў у нашу грамадскую прыёмную: хвалююцца тыя, хто незарэгістраваны і займаецца, здавалася б, абсалютна бяскрыўднай дзейнасцю, хто спрабаваў зарэгістравацца і атрымаў адмову. Рэгістрацыя міжнароднай арганізацыі ў іншай краіне — абсалютна не выйсце з сітуацыі. Мы жывём у нашым прававым полі, і артыкул дзейнічае тут, а не за мяжой. Калі міжнародная арганізацыя працуе на тэрыторыі Беларусі, яна мусіць зарэгістраваць тут прадстаўніцтва.


Фота Юрыя Дзядзінкіна
Уладзімір Лабковіч

**«Малады Фронт» таксама безвынікова спрабавалі зарэгістравацца некалькі разоў.**

Разам з тым менавіта сябры гэтай арганізацыі найбольш пацярпелі ад прымянення на практыцы артыкулу 193–1 Крымінальнага кодэкса.


Фота Юрыя Дзядзінкіна
Зміцер Дашкевіч

У 2007 годзе адзінаццаць маладафронтаўцаў былі асуджаныя за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, у тым ліку і яе лідэр Зміцер Дашкевіч.

Кіраўнік арганізацыі Зміцер Дашкевіч лічыць, што асаблівых праблем з-за нерэгістрацыі ў Беларусі «МФ» цяпер не мае. «Малады Фронт» падчас крымінальнага пераследу выбіў сабе права дзейнічаць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, — падкрэслівае Дашкевіч. — Улады нічога гэтым пераследам не дамагліся, таму, уласна, яго і спынілі. Мы дзейнічаем як і любая іншая структура. Маем юрыдычны статус у Чэхіі і ад імя арганізацыі звяртаемся ў розныя дзяржаўныя структуры, адказы прыходзяць на імя «Маладога Фронту». У нерэгістрацыі ёсць і станоўчыя моманты — Мінюст не можа на нас уплываць. Напраклад, улады маглі маніпуляваць некаторымі партыямі, не зацвярджаючы некаторыя іх рашэнні».

Цяпер кіраўніцтва «Маладога Фронту» не збіраецца засяроджвацца на рэгістрацыі, а накіроўвае сілы на правядзенне розных кампаній — ад палітычных да культурніцкіх. «Мы рэалісты. Лукашэнка асабіста гаварыў, што не дапусціць у Беларусі дзейнасці МФ, — зазначае Дашкевіч. — У дзяржаве дзейнічае шэраг партый-арганізацый з моладзевымі структурамі, і ўлады могуць уплываць на іх дзейнасць. Найперш трэба працаваць з людзьмі праз розныя кампаніі. У нашых акцыях прымае ўдзел вялікая колькасць асоб, якія не маюць дачынення непасрэдна да арганізацыі. А надуманыя адмовы ў рэгістрацыі толькі паказваюць сутнасць рэжыму, яго непавагу да законаў і сваіх грамадзян».

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

# МАРАЛЬНАСЦЬ НА МЕСЦАХ

**У красавіку «НЧ» публікаваў ліст чытача з вёскі Дукора Пухавіцкага раёна Сяргея Шостака, які расказваў пра канфлікт паміж мясцовым кіраўніцтвам і жыхарамі вёскі. Мы публікуем чарговы аповед спадара Шостака на тэму ўзаемаадносін улады і падначаленых.**

Часам два чалавекі глядзяць у адну і тую ж лужыну, але адзін бачыць зоркі, што ў ёй адлюстроўваюцца, а другі — бруд.

Яшчэ ў снежні 2006 года былая загадчыца малочна-таварнай фермай СВК «Дукора» Валянціна Дзядзенка, яе сястра даярка Тамара Бандолік з мужам Мікалаем звярнуліся ў праваахоўныя органы з заявай аб тым, што па загадзе старшыні Дамарада прыпісвалася малако на ферме. Справа дайшло да таго, што фактычны надой стаў амаль роўны таварнасці малака (то бок, колькі надаілі, столькі і здалі дзяржаве). Акрамя таго, яны паведамілі, што з дапамогай «мёртвых душ» з касы гаспадаркі выкрадзена 3 мільёна рублёў.

У студзені 2007 года прыехала камісія на чале з чыноўнікам камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню аблвыканкама Хамічом. У выніку за подпісам намесніка старшыні Мінскага аблвыканкама Л. Зайца быў складзены ліст, паводле якога атрымлівалася, што прыпіскі Валянціне Дзядзенка прысніліся, і яна сама выпаіла малако цялятам звыш нормы або яно скісла. Пасля па справе дапыталі мяне, я пацвердзіў заяву былой загадчыцы малочна-таварнай фермы, але праз нейкі час расплаціўся за гэта працай — пасаду юрысконсульта скарацілі. Аднак жа праблемы ў фігурантаў гэтай гісторыі не скончыліся: высветлілася, што шматдзетная сям'я Бандолік жыве ў службовым жылым памяшканні, хаця і пражывалі яны ў гэтым доме з 2001 года, а службовым ён быў прызнаны ў 2003-м. Летась у кастрычніку рашэннем суда шматдзетная сям'я (у Бандолікаў чацвёра дзяцей) была выселеная на вуліцу. Аляксандр Лукашэнка нядаўна гаварыў, што шматдзетным маці павінны быць адчыненыя ўсе дзверы (меліся на ўвазе дзверы чынавенскіх кабінетаў). Але Тамары Раманаўне адкрылі толькі адны дзверы з шыльдаю «Прэч з хаты». Дарэчы, у 1991 годзе гэтую сям'ю выселілі з вёскі ў Брагінскім раёне, аднак жылля, якое адмыслова будуецца на чыстай тэрыторыі, Бандолікам не далі. Атрымліваецца, дзяржава двойчы пазбавіла шматдзетную сям'ю даху над галавой.

Выявілася, што на «службовы» дом Бандолікаў паклалі вока іншыя людзі. Ад 2006 года прадпрымальнік Канстанцін пражывае разам з жонкай і цёшчай не ў вельмі прасторнай кватэры, мае ў вёсцы Дукора кафэ. І тут высветлілася, што яго цёшча Валянціна Гоман, замест звольненага юрыста з'яўляецца сакратаром праўлення і па сумяшчальніцтве спецыялістам па кадрах у СПК «Дукора». На агульным сходзе СВК «Дукора», калі вырашалася пытанне аб выдачы сакратару праўлення Валянціне Гоман жылога дома, у якім жыла выселеная шматдзетная сям'я Бандолік, супраць станоўчага рашэння выступіла намесніца старшыні па ідэалогіі, старшыня прафкама Людміла Шкробат, аднак да яе меркавання не прыслухаліся. Спадарыня Шкробат у гэтай сітуацыі праявіла сябе куды больш маральна за старшыню СВК «Дукора» Дамарада, які, напрыклад, атрымлівае 50-працэнтную надбаўку за прырост малака і ў той жа час звальняе з працы галоўнага заатэхніка за «перавыпайку малака цялятам», дорыць бізнесменам вясковую сажалку ці высяляе з дому сям'ю, у якой чацвёра дзяцей.

СПРАВА

# Юрый Лявонаў: ЦЯПЕР Я ЦАЛКАМ НА СВАБОДЗЕ

**У дачыненні да аднаго з фігурантаў справы ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Юрыя Лявонава спынены крымінальны пераслед. Мікалай Аўтуховіч і Уладзімір Асіпенка застаюцца ў следчым ізалятары ад 8 лютага. Іх абвінавачваюць па арт. 218 Крымінальнага кодэкса (наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці).**



23 чэрвеня «ў дачыненні да Аўтуховіча і іншых асоб» заведзена справа па арт. 359 Крымінальнага кодэкса (тэрарыстычны акт) у выглядзе падрыхтоўкі (арт. 13). Мікалай Аўтуховіч на працягу 91 дня трымаў галадоўку пратэсту, патрабуючы паскорыць разбіральніцтва справы і правесці адкрыты суд. Беларускія праваабаронцы лічаць затрыманых палітычнымі зняволенымі. У 2006 годзе Аўтуховіч і Лявонаў былі асуджаныя, тады міжнародная супольнасць прызнала іх вязнямі сумлення.

Размову з журналісткай «НЧ» Вольгай Хвоін Юрый Лявонаў пачаў словамі: «Цяпер я цалкам на свабодзе».

***— Як думаеце, калі можна чакаць судовага працэсу над Аўтуховічам і Асіпенкам?***

— Паводле маіх звестак, следства плануецца завяршыць 8 кастрычніка. Далей — матэматычны разлік: тры тыдні на азнаямленне са справай падследных, у пракуратуры справу будуць разглядаць месяц-паўтара, а затым перададуць у суд.

***— Пад Новы год атрымліваецца?***

— Гэта, канешне, не дакладна, але мае крыніцы гавораць, што справу хочуць як мага хутчэй перадаць у суд. Аднак нешта канкрэтнае гаварыць немагчыма, бо ў гэтым працэсе задзейнічана многа інстанцый, і невядома, як яны будуць сябе паводзіць.

***— Магчыма, маеце нейкія звесткі, на чым следства будуе абвінаваўчую лінію?***

— Усё трымаецца ў поўнай таямніцы. Думаю, што доказная база збіраецца па прынцыпу апытання людзей. Нехта выказа кепскае меркаванне наконт Аўтуховіча — ідуць, размаўляюць з людзьмі. Але наўрад ці нешта з абвінаваўчых закідаў пацвярджаецца. На сённяшні дзень ёсць толькі словы — за і супраць Аўтуховіча, пра матэрыяльныя доказы мне нічога не вядома. Цяпер у мяне з'явіліся сведчанні таго, што першая справа ў 2006 годзе супраць Аўтуховіча і мяне была банальнай помстаю чыноўнікаў. І сёлетнія падзеі вельмі падобныя на тыя. Была замова на Мікалая, аднак «прэсаваць» аднаго несаліднa, дык пад раздачу патрапіў я. Цяпер больш да месца прыйшоўся Уладзімер Асіпенка, вось і стварылі групу «злачынцаў». Не думаю, што ва ўсім гэтым ёсць неякі асабісты матыў, проста так атрымалася.

***— Ці ёсць у вас якія-небудзь прагнозы адносна выніку гэтай справы?***

— Мне хацелася б, каб Мікалая і Уладзімера вызвалілі ў зале суда, вельмі хацелася б. Але як будзе на самой справе — невядома. Хаця ёсць варыянты, мы ж не жывём у замкнёным адасобленым свеце.

***— Справа досыць гучная, якія меркаванні ў жыхароў Ваўкавыску?***

— Сябры падтрымліваюць, ворагаў у мяне ніколі не было. Што думаюць звычайныя жыхары, я не ведаю, бо не апытваю іх на вуліцах. У мясцовыя газеты звяртацца, каб данесці сваю кропку гледжання, бессэнсоўна, усё адно не прапусцяць.

***— Чым цяпер займаецеся?***

— Я зараз без працы, магчымасцяў для свайго бізнесу пакуль не бачу. Але, натуральна, недзе ж працаваць буду.

***— Ці разглядаеце магчымасць пераезду ў іншую краіну? Усе гэтыя падзеі не выклікалі расчаравання ў Беларусі?***

— Беларусь — харошая краіна, тут добрыя людзі, і рабіць нейкія стратэгічныя высновы з-за купкі нягоднікаў няма сэнсу. Наконт свайго пераезду пакуль не думаў.

КАЛОНКА ЮРЫСТА

# АД СПЕЦАДЗЕННЯ ДА МОГІЛАК



**Мы працягваем публікацыю адказаў вядомага юрыста і праваабаронцы Алега Волчака на пытанні грамадзян, якія звярнуліся ў грамадскую прыёмную.**

- *Мой сын скончыў тэхнікум і па размеркаванні ўладкаваўся на завод. Як высветлілася, ён працуе не па спецыяльнасці. Ці можна скасаваць працоўны кантракт?*
  *Кляцкова А. С., Орша*

У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку і ўмовах прадастаўлення першага працоўнага месца выпускнікам дзяржаўных устаноў адукацыі і Палажэннем аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю, вы маеце права патрабаваць паўторнага пераразмеркавання, але для гэтага неабходна з пісьмовай заявай звярнуцца ва ўстанову, якая размеркавала вашага сына. Падставай з'яўляецца права на першае працоўнае месца пасля атрыманай адукацыі.

- *Мой сваяк працуе вальшчыкам лесу ў жылкамунгасе. Ці мае ён права патрабаваць ад працадаўцы забеспячэння яго спецвопраткай?*
  *Дамарадаў А. В., Віцебск*

У адпаведнасці з тыпавымі галіновымі нормамі выдачы спецвопраткі для працаўнікоў лясной, лесанарыхтоўчай гаспадаркі, вашага сваяка абавязаны забяспечыць спецвопраткай, і толькі пасля гэтага дапусціць да працы.

Норма выдачы: ахоўная каска са шчытком і навушнікамі, антывібрацыйныя рукавіцы, касцюм з тканіны з абаронай ад парэзу ланцугом пілы і адмысловы абутак з металічнай ахоўнай устаўкай. На зіму павінна выдавацца ўцепленая спецвопратка. У выпадку невыканання гэтых нормаў, кіраўніцтва жылкамунгаса можа быць прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці.

- *У нас з мужам ёсць дом, атрыманы ў спадчыну. Яго мы выкарыстоўваем як дачу. Суседзі, якія пражываюць побач, высадзілі пад самым нашым плотам кусты і земляную грушу, якія ствараюць цень і збіраюць вільгаць, ад гэтага гніе плот паміж нашымі ўчасткамі. На патрабаванні прыбраць расліны далей ад плота суседзі не рэагуюць. Што рабіць?*
  *Качан М. В., Пінск*

Парадак карыстання ўчасткам рэгламентуецца Дапаможнікам П1-97 да СНіП 2.07.01-89г «Планіроўка і забудова раёнаў сядзібнага жыллёвага будаўніцтва ў населеных пунктах Рэспублікі Беларусь», у якім вызначаны наступныя нормы:

- пладова-ягадныя кусты — не меней 1 метра ад плота;
- нізкарослыя дрэвы — не меней 2 метраў;
- высокія дрэвы — не меней 3 метраў.

Бліжэй за ўказаную адлегласць дазваляецца рабіць градкі.

Для вырашэння спрэчак неабходна звярнуцца з пісьмовай заявай у землеўпарадкавальную, архітэктурную службы або ў органы мясцовага кіравання.

- *Якім нарматыўным дакументам рэгламентуецца парадак пахавання, і ці можна сваякам у магіле памерлага паўторна пахаваць сваіх блізкіх?*
  *Краўчук С. П., Мінск*

Парадак пахавання і звязаныя з гэтым мерапрыемствы рэгламентуюцца Законам РБ «Аб пахаванні». Паўторнае пахаванне дазваляецца па пісьмовай заяве блізкіх сваякоў памерлых (бацькі, дзеці, родныя сёстры, браты) па заканчэнні 20 гадоў з моманту першага пахавання, пры ўмове наяўнасці вольнага месца ў межах агароджы не меней аднаго метра. Участак для новага пахавання прадстаўляецца памерам 2 на 2,3 метра.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 5 КАСТРЫЧНІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

### Беларусь 1

05.35 Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05, 07.05, 08.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 08.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.30 У свеце матораў.
09.10 Nota Bene.
09.35 «Здароўе».
10.05 «Жыццё як жыццё». Жаночае ток-шоў.
11.00 Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія). Закл. серыя.
12.10 Меладрама «Жаночае сяброўства».
14.05 Культурныя людзі.
14.30 «Марскі дазор». Відэафільм АТН.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
15.55 Серыял «Тэрмінова ў нумар» (Расія).
16.45 Меладрама «Сёстры па крыві».
17.45 Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія). 1-я серыя.
18.50, 00.40 «Зона Х». Крымінальная хроніка.
19.30 «Арэна». Праграма аб спорце.
19.55 Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія).
21.00 Панарама.
21.50 Адмысловы рэпартаж АТН «Дацягнуцца да нябёсаў».
22.00 Кінараман «Вайна і мір» (Італія-Францыя-Расія). 1-я серыя.
00.10 «Эпоха». Зоркі Венецыянскага кінафэсту. Фільм 1-ы.
00.45 Дзень спорту.

### ОНТ

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Контуры.
10.10 АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольны закуп».
11.40 «Ералаш».
12.00 «Малахаў+».
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 «Зразумець. Прабачыць».
13.40 «Модны прысуд».
14.40 «Дэтэктывы».
15.15 «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 Ералаш.
16.45 АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
22.00 «Выратуй мяне». Шматсер. фільм.
23.05 Нашы навіны.
23.20 Навіны спорту.
23.25 АНТ прадстаўляе: «Злачынствы стагоддзя».
00.00 «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
00.30 «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
01.20 Нашы навіны.
01.25 Навіны спорту.

### СТВ

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца. Студыя добрага настрою».
07.40 «СТБ-спорт».
07.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
08.30 «Тыдзень».
09.30 «Вялікі сняданак».
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
11.45 «Званая вячэра».
12.35 «Пуцявікі». Серыял.
13.50 «Зорны рынг».
15.05 «Я - вандроўца».
15.30 «Прыватныя гісторыі».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Спартовы тыдзень».
17.10 «Наша справа».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.25 «Пуцявікі». Серыял. Закл. серыя.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.20 «Добры вечар, маляня».
20.35 Фільм «Выйсце». Украіна, 2009 г.
22.55 «Сталічныя падрабязнасці».
23.00 «Сталічны футбол».
23.30 «Гучная справа».

### ЛАД

07.00 ЛАДная раніца.
08.00 Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
08.30 У гэты дзень.
08.35 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
09.35 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
10.35 Рамантычная камедыя «Асцярожна, бландынкі!» (Расія). 1-я-4-я, закл. серыі.
13.40 «Пра мастацтва».
14.10 Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
15.40 Мультсерыял «Русалачка» (ЗША). 1-я і 2-я серыі.
16.25 Пазакласная гадзіна.
16.40 Тэлебарометр.
17.00 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
18.00 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
19.05 Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
19.45 «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
20.45 Калыханка.
21.00 Музычная камедыя «Прыходзьце заўтра» (СССР).
22.55 Хакей. Формула гульні.
23.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

### РОССИЯ

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.20 Тэлесерыял «Адночы будзе каханне». Расія, 2009 г.
10.10 «Іх маглі не выратаваць. Вязні Кугрыльскага квадрата». Дак. фільм.
11.00 Весткі.
11.25 «Ранішняя пошта».
11.55 Дэтэктыў «Апошні загад генерала». Расія, 2006 г.
13.25 Гарадок.
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
15.10 Фільм «Бульварны раман».
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 «Гарадок». Дайджэст.
17.55 Прэм'ера. «Карміліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 Прэм'ера. Тэлесерыял «Адночы будзе каханне». Расія, 2009 г.
20.30 Тэлесерыял «Паштальён». Расія.
22.30 Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
23.30 «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
23.45 Навіны - Беларусь.
23.55 «Весткі+».
00.15 «Дзяжурны па краіне».
01.05 Заканчэнне эфіру.

### НТВ

06.00 Сёння.
06.05 Канал «Сёння раніцай».
08.40 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
09.10 «Крамлёўская кухня».
10.00 Сёння.
10.20 «Сярэдні клас».
11.10 «Кулінарны паядынак».
12.10 «Следства вялі...».
13.00 Сёння.
13.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
15.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.00 Сёння.
16.30 Крымінальны серыял «Ліцейны».
18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.00 Сёння.
19.35 Прэм'ера. Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў-9».
21.40 Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Я - целаахоўнік. Памылка ў праграме».
22.40 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
23.00 Сёння.
23.25 «Сумленны панядзелак».
00.15 «Калекцыя дурасцяў Максіма Кананенка».
00.45 «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

09.30 Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Дзень 3.
10.00 Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай).
15.45 Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 3.
17.30 Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/8 фіналу. Александрыя (Егіпет).
19.30 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
20.15 Футбол. Еўрагалы.
20.30 Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 3.
21.20 Вось дык так!!!
21.30 Армрэстлінг. PAL/NAL.
22.00 Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
22.30 Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
23.30 Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
00.30 Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/8 фіналу. Александрыя (Егіпет).
01.30 Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
01.45 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

19.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
19.05 «Элі Макбіл», тэлесерыял.
19.50 На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
20.20 Госць «Белсату».
20.40 Беларусы ў Польшчы.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.20 Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла» (спазнаваўчая праграма).
21.30 «Ноч без месяца», маст. фільм, 2004 г., Албанія–Францыя.
22.45 Аб'ектыў.

## 6 КАСТРЫЧНІКА, АЎТОРАК

### Беларусь 1

05.35 Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05 Дзень спорту.
06.10, 07.05, 08.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 08.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.35 «Арэна». Праграма аб спорце.
09.05 Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія).
10.00 Меладрама «Сёстры па крыві».
10.50 Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія). 1-я серыя.
11.40 Адмысловы рэпартаж АТН «Дацягнуцца да нябёсаў».
12.10 Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША- Вялікабрытанія).
13.05 Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс».
13.45 Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
14.30 «Малюнак святлом». Відэафільм АТН.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
15.55 Серыял «Тэрмінова ў нумар» (Расія).
16.45 Меладрама «Сёстры па крыві».
17.50 Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія). 2-я серыя.
18.50, 00.25 «Зона Х». Крымінальная хроніка.
19.30 Сфера інтарэсаў.
19.55 Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія).
21.00 Панарама.
21.50 Кінараман «Вайна і мір» (Італія-Францыя-Расія). 2-я серыя.
00.00 «Эпоха». Зоркі Венецыянскага кінафэсту. Фільм 2-і.
00.35 Дзень спорту.

### ОНТ

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Чакай мяне.
10.05 «Дальнабойнікі».
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
12.00 «Малахаў+».
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 «Зразумець. Прабачыць».
13.40 «Модны прысуд».
14.40 «Дэтэктывы».
15.15 «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
17.10 «Хай кажуць».
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
19.00 «Рудая». Шматсерыйны фільм.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 Шматсерыйны фільм «Я вярнуся».
22.10 «Выратуй мяне». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
23.10 Нашы навіны.
23.25 Навіны спорту.
23.30 «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
00.25 «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
01.15 Нашы навіны.
01.30 Навіны спорту.

### СТВ

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца. Студыя добрага настрою».
07.40 «СТБ-спорт».
07.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
08.30 Фільм «Выйсце». Украіна, 2009 г.
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
11.45 «Званая вячэра».
12.40 «Пуцявікі». Серыял. Закл. серыя.
13.50 «Крокі да поспеху».
14.40 «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
15.30 «Рэтраманія».
16.50 «Сталічны футбол».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.25 Прэм'ера! «Былая». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.20 «Добры вечар, маляня».
20.30 «Аўтапанарама».
20.50 «Трэцяга не дадзена». Серыял.
22.00 Прэм'ера! «З чаго пачынаецца Радзіма».
22.55 «Сталічныя падрабязнасці».
23.00 «Надзвычайныя гісторыі».
23.55 «Спецназ». Серыял.

### ЛАД

07.00 ЛАДная раніца.
08.00 Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
08.30 У гэты дзень.
08.35 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
09.35 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
10.40 Музычная камедыя «Прыходзьце заўтра» (СССР).
12.20 «Запал па культуры».
13.00 Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
13.45 Хакей. Формула гульні.
14.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
15.05 Мультфільм.
15.20 Мультсерыял «Русалачка» (ЗША). 3-я і 4-я серыі.
16.05 Пазакласная гадзіна.
16.25 Свая кампанія.
17.00 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
18.00 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
19.05 Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
19.45 Беларуская часіна.
20.50 Калыханка.
21.05 Трагікамедыя «Мастацтва жыць у Адэсе» (СССР).
23.10 Спорт-кадр.
23.35 Хакей. Нёман (Гродна) - Сокал (Кіеў).

### РОССИЯ

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.20 Тэлесерыял «Адночы будзе каханне». Расія, 2009 г.
10.10 «Ніна Меньшыкава. Сэрца маці». Дакументальны фільм.
11.00 Весткі.
11.30 «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
11.45 Тэлесерыял «Паштальён». Расія.
13.25 «Гарадок». Дайджэст.
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
15.10 Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар».
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 «Гарадок». Дайджэст.
17.55 Прэм'ера. «Карміліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 Прэм'ера. Тэлесерыял «Адночы будзе каханне». Расія, 2009 г.
20.30 Тэлесерыял «Паштальён». Расія.
22.30 Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
23.30 Навіны - Беларусь.
23.40 «Весткі+».
00.00 Прэм'ера. «Крыштальная ноч». Яўрэйскі пагром-1938». Дак. фільм.
00.55 Заканчэнне эфіру.

### НТВ

06.00 Сёння.
06.05 Канал «Сёння раніцай».
08.40 «Чыстасардэчнае прызнанне».
09.10 «Анатоль Кашпіроўскі».
10.00 Сёння.
10.20 «Сярэдні клас».
11.10 «Кватэрнае пытанне».
12.05 Вострасюжэтны дэтэктыў «Вуліцы пабітых ліхтароў-9».
13.00 Сёння.
13.30 Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
15.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.00 Сёння.
16.25 Крымінальны серыял «Ліцейны».
18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.00 Сёння.
19.35 Прэм'ера. Вострасюжэтны дэтэктыў «Вуліцы пабітых ліхтароў-9».
21.45 Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Я - целаахоўнік. Памылка ў праграме».
22.45 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
23.00 Сёння.
23.25 «Вочная стаўка».
00.10 «Фатальны дзень. Трансвааль - страчаны рай».

### EUROSPORT

09.30 Вось дык так!!!
09.45 Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
10.00 Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай).
15.45 Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 4.
17.30 Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/8 фіналу. Александрыя (Егіпет).
19.30 Футбол. Еўрагалы. Навіны.
19.40 Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 4.
21.00 Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/8 фіналу. Александрыя (Егіпет).
23.00 Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 4.
00.00 Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
00.15 Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
00.30 Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Агляд.
01.30 Супербайк. Чэмпіянат свету. Траса Маны-Кур (Францыя). Заезд 2.
02.15 Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

19.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
19.05 МакраФон: «Жывёлак» і «Стылё».
19.35 Тыдзень з радыё «Свабода».
20.10 Акно ў Еўропу.
20.40 Асабісты капітал.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.20 Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крыжакі» (спазнаваўчая праграма).
21.30 Блізкая гісторыя: іншы погляд: «Загуж – апошні прыпынак», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Расія.
21.50 Аўтастопам праз Еўропу, 4 серыя.
22.10 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
22.25 «Калыханка» ад Сашы і Сірожы: «Манахі».
22.40 Аб'ектыў.

# 9 ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 9 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія).
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві» (Расія-Украіна).
**10.55** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія). 4-я серыя.
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША ? Вялікабрытанія).
**13.05** Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс-2» (ЗША). 1-я серыя.
**13.45** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**14.30** «Шпілька».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія). 5-я серыя.
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**23.35** Псіхалагічная драма «Увасхрашаючы мерцвякоў» (ЗША).
**01.40** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** Шматсерыйны фільм «Я вярнуся».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Дэтэктывы».
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** АНТ прадстаўляе: «Зваротны адлік».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Хвіліна славы».
**22.40** АНТ прадстаўляе: «Наша Белараша».
**23.15** Трылер «Кроў і шакалад».
**00.55** Нашы навіны.
**01.10** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінгшчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Спецназ». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Трэцяга не дадзена». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** Прэм'ера! «Былая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Таксі». Францыя, 1998 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.15** Фільм «Паляванне на звера». Канада-Вялікабрытанія-Ганконг, 2003 г.
**01.40** «Уцёкі». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Час футболу.
**08.30** У гэты дзень.
**08.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Жансавет.
**10.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.05** Псіхалагічны дэтэктыў «Крымінальны талент» (СССР). 2-я серыя.
**12.35** Іншыя.
**13.05** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
**14.30** Эксцэнтрычная камедыя «Тры жанчыны і мужчына» (Беларусьфільм).
**16.05** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** «Пра мастацтва».
**19.35** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Лазер Алфёрава» («Беларусьфільм»).
**19.55** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.20** Бітва экстрасэнсаў.
**22.25** Камедыйная меладрама «Кактус і Алена» (Расія).
**00.25** Авантурная камедыя «Матадор» (ЗША - Германія - Ірландыя).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.05** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Прынцэса і жабрачка». Расія, 2009 г.
**13.10** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Пакой смеху».
**15.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар».



**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** Прэм'ера. «Карміліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала-2009». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.30** Фільм «Апошні забой». Расія, 2006 г.
**00.30** Навіны - Беларусь.
**00.40** Фільм «Толькі ўдваіх».
**02.05** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Паштальён». Расія, 2009 г.
**13.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Пакой смеху».
**15.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** Прэм'ера. «Карміліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Прэм'ера. «Крывое люстэрка».
**22.40** Навіны - Беларусь.
**22.50** Фільм «Пеца па дарозе ў Царства Нябеснае». Расія, 2009 г.
**00.50** Заканчэнне эфіру.

### EUROSPORT

**09.30** «За чыстую планету». Часопіс.
**10.00** Тэніс. Турнір WTA у Кітаі (Пекін). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**13.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Іспаніі». Агляд.
**14.30** Снукер. Гран-пры (Глазга, Шатландыя). 1/8 фіналу.
**15.30** Снукер. Гран-пры (Глазга, Шатландыя). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**17.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў у Егіпце (Александрыя). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**19.40** Снукер. Гран-пры (Глазга, Шатландыя). 1/4 фіналу.
**21.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў у Егіпце (Александрыя). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.00** Снукер. Гран-пры (Глазга, Шатландыя). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**00.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў у Егіпце (Александрыя). Навіны.
**00.15** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**00.25** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў у Егіпце (Александрыя). 1/4 фіналу.
**01.20** Экстрэмальны спорт. Free Ride Spirit.
**01.35** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў у Егіпце (Александрыя). 1/4 фіналу.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.15** «Такіх песень сабе шукаю», 2008 г., Польшча.
**19.55** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 1.
**20.35** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ці існаваў старажытнарускі народ?» (спрэчаваўчая праграма).
**21.25** «Вяселле», маст. фільм, 2004 г., Польшча.
**23.05** Аб'ектыў.

## 10 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

### 1

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Афрыка. Магічны кантынент» (Францыя). 1-я серыя.
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Прэм'ера. Тэлесерыял «Вясковая камедыя» (Расія). 1-я серыя.
**10.35** «Шпілька». Праграма для жанчын.
**11.10** Ранішняя хваля.
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Меладрама «Жонка сышла» (СССР).
**14.00** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.40** «Алімпійскі часопіс».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Вакол планеты».
**16.15** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**16.35** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**17.40** Відэафільм АТН «Ад Касцюковіч да персідскага цара» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** «Залаты шлягер-2009 у Магілёве». Канцэрт памяці М.Таніча.
**21.00** Панарама.
**21.40** «Залаты шлягер-2009 у Магілёве». Юбілейны канцэрт ансамбля «Беларускія пясняры».
**00.00** «Уласнай персонай».

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.05** «Асяроддзе пасялення. Бытавая «хімія».
**12.10** Прэм'ера. «Аляксандр Міхайлаў. Трэба заставацца мужыком».
**13.10** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.40** АНТ прадстаўляе: «Кінаметры вайны». «Вялікі старт. Іду шукаць».
**14.15** «Іду шукаць». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Суботні «Ералаш».
**16.45** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**17.50** АНТ прадстаўляе: «Футбол. Адборачны матч чэмпіянату свету. Беларусь-Казахстан». Прамая трансляцыя.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Ірына Радніна. 6.0». Юбілейны вечар.
**22.20** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.00** «Што? Дзе? Калі?».
**00.25** Прэм'ера. Хідзінк. Гус Іванавіч».

### ТВ

**06.35** «Фірмовая гісторыя». Камедыйны серыял.
**07.25** Фільм «Госця з будучыні». СССР, 1984 г. 1-я і 2-я серыі.
**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.00** «Ваенная таямніца».
**15.00** Фільм «Тэатр». СССР, 1978 г. 1-я серыя.
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Top Gear. Руская версія».
**18.10** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «З чаго пачынаецца Радзіма».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.35** Фільм «Парфумер: гісторыя аднаго забойцы». Германія-ЗША-Францыя, 2006 г.



**00.15** Фільм «Браты Грым». ЗША-Вялікабрытанія-Чэхія, 2005 г.
**02.10** «Уцёкі». Серыял.

### ЛАД

**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.30** Усё аб бяспецы.
**08.55** Камедыйная меладрама «Кактус і Алена» (Расія).
**10.40** Жансавет.
**11.15** Свая кампанія.
**11.55** Мультфільм.
**12.10** «Лабірынты: Чарэя Сапегаў».
**12.40** «Запал па культуры».
**13.25** «Папая». Дакументальны фільм (Беларуская тэлебачанне).
**13.55** Хакей. КХЛ. Трактар (Чэлябінск) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**16.20** Дэтэктыў «Мой ласкавы і пяшчотны мент» (Расія). 1-я-4-я, заключна, серыі.
**19.40** Канцэрт майстроў мастацтваў Расіі.
**21.15** Крымінальная камедыя «Мама не гаруй» (Расія).
**23.00** Казанова.
**23.30** Рамантычная моладзевая камедыя «У пагоні за Эмі» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** «Здабытак рэспублікі».
**07.40** «Крывое люстэрка».
**09.40** «Ранішняя пошта».
**10.15** «Суботнік».
**11.00** Весткі.
**11.15** Пакой смеху.
**12.10** Фільм «Пеца па дарозе ў Царства Нябеснае». Расія, 2009 г.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Каменская».
**15.20** Фільм «Позняя сустрэча».
**16.55** Фільм «Крымінальны талент». 1-я серыя.
**18.20** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Суботні вечар».
**21.40** Фільм «Надзея як сведчанне жыцця». Расія, 2007 г.
**00.55** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.35** «Казкі Бажанава».
**08.00** Сёння.
**08.15** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Алтар перамогі. Нармандыя - Нёман».
**14.10** Прэм'ера. Дэтэктыўны трылер «Бумеранг».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Жаночы погляд».
**17.10** Дэтэктыўны серыял «Эксперты».
**19.00** Сёння.
**19.25** Прэм'ера. «Гены супраць нас».
**20.45** Прэм'ера. Крымінальная драма «Законы Брукліна».
**22.40** Баявік «Бясспрэчны».
**00.20** Камедыя «Правілы сэксу-2: Хэпіэнд».

### EUROSPORT

**09.35** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/4 фіналу. Александрыя (Егіпет).
**10.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**11.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). 1/2 фіналу.
**12.45** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). 1/4 фіналу.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). 1/2 фіналу.
**15.45** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). 1/2 фіналу.
**17.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/4 фіналу. Александрыя (Егіпет).
**19.30** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). 1/2 фіналу.
**21.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/4 фіналу. Александрыя (Егіпет).
**23.00** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). 1/2 фіналу.
**00.30** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Агляд.
**01.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**01.45** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). 1/2 фіналу.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.20** Аўтастопам праз Еўропу, 5 серыя: Парыж.
**19.35** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма).
**20.00** Еўропа сёння.
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларусы ў гусіцкіх войнах».
**21.20** Суботні сеанс: «Заткніся і забі мяне», маст. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія–Чэхія.
**22.45** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 11 КАСТРЫЧНІКА, НЯДЗЕЛЯ

**1**

**07.30** Анімацыйны прыгодніцкі фільм «У пошуках Нема» (ЗША).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Арсенал.
**09.30** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.45** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.55** «У свеце матораў».
**11.30** «Nota Bene».
**12.10** Камедыя «Вяселле ў Малінаўцы» (СССР).
**14.00** Відэафільм АТН «Анжаліка Агурбаш: Каханне? Каханне! Каханне?».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «ЦЫРКавыя людзі».
**15.55** Эксцэнтрычная камедыя «Тупы і яшчэ больш тупы» (ЗША).
**18.00** Суперлато.
**19.15** «OFF STAGE LIFE».
**19.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**22.35** Прэм'ера. Крымінальная драма «Шлюб» (ЗША - Канада).

**ОНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** АНТ прадстаўляе: «Зваротны адлік».
**13.35** «Авіяслалам. Чэмпіянат свету».
**14.35** Тэорыя неверагоднасці.
**15.25** «Песні Перамогі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Канцэрт М.Задорнава.
**17.45** «Легенда аб трох ключах». Францыя - Бельгія, 2007.
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Вялікая розніца».
**22.40** Фільм «Каханне-морква».



**СТВ**

**06.45** «Дарагая перадача».
**07.10** «Фірмовая гісторыя». Камедыйны серыял.
**08.00** Фільм «Таксі». Францыя, 1998 г.
**09.30** «Добры дзень, доктар!».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Аўтапанарама».
**14.00** «Прыватныя гісторыі».
**15.00** Фільм «Тэатр». СССР, 1978 г. Заключная серыя.
**16.20** «Рэальны спорт».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Дзённікі няні». ЗША, 2007 г.



**22.45** Фільм «Брудныя люботы». Вялікабрытанія, 2002 г.
**00.25** «Уцёкі». Серыял.

**ЛАД**

**07.40** Мір вашай хаце.
**07.50** Дабравест.
**08.20** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.50** Рамантычная меладрама «А вы яму хто?» (Расія).
**10.25** Школа рамонту.
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.10** Пасоўванне+.
**12.25** Гаспадар.
**12.55** Хакей. Керамін (Мінск) - Хімік-СКА (Наваполацк). Прамая трансляцыя.
**15.15** Прыгодніцкі баявік «Робін Гуд» (Ганконг).
**17.30** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Фатограф Ульяна» («Беларусьфільм»).
**18.00** Гандбол. Кубак ЕГФ. СКА (Мінск) - Строналас (Кіпр).
**19.30** Еўрапейскі канцэрт.
**20.20** Тэлебарометр.
**20.40** Экспедыцыя.
**21.10** Крымінальная камедыя «Мама не гаруй-2» (Расія).
**23.15** «Свая музыка. Працяг».
**23.45** «Правы чалавека».
**00.00** Містычны трылер «Катакомбы» (ЗША).

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** «Хто ў хаце гаспадар».
**07.45** Фільм «Надзея як сведчанне жыцця».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Эдгар і Крысціна».
**14.00** Весткі.
**14.15** Тэлесерыял «Каменская».
**15.15** «Смехапанарама».
**15.40** Фільм «Крымінальны талент». 2-я серыя.
**17.20** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**17.40** Прэм'ера. «Песні кіно».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.25** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** Фільм «Рэцэпт вядзьмаркі».
**22.35** «Спецыяльны карэспандэнт».
**23.45** Фільм «Толькі ў мюзік-холе».

**НТВ**

**07.35** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Барацьба за ўласнасць».
**11.20** «Асабліва небяспечны!».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Ты не паверыш!».
**14.10** Меладрама «Знікненне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Крамлёўская кухня. Казённае здароўе».
**17.10** Дэтэктыўны серыял «Эксперты».
**19.00** Сёння. Вынікова праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.05** Прэм'ера. «Сеанс з Кашпіроўскім. Знакі лёсу».
**22.05** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Сёмін».
**00.00** «Авіятары».
**00.30** Прэм'ера. «Антытэрор».

**EUROSPORT**

**09.30** Катрынг. Чэмпіянат свету. Макау.
**10.30** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР.
**11.30** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Бельгія - Турцыя.
**12.15** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Сербія - Румынія.
**13.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Расія - Германія.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін (Кітай). Фінал.
**16.00** Веласпорт. Велагонка «Тур Парыжу». Францыя.
**18.00** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Фінал.
**19.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Бельгія - Турцыя.
**20.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Сербія - Румынія.
**20.45** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Расія - Германія.
**21.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**22.00** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Фінал.
**01.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР.
**02.00** Армрэстлінг. PAL/NAL.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**19.05** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**20.10** Форум (ток-шоу): «За калючым дротам. Ці мы гатовыя да дэмакратыі?»
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.50** Фільматэка майстроў: «Пупенда», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ______ (по реестру ф. 11)
№ ______ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________________ руб.

______________________________
(сумма прописью)

Кому
Куда
Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ______________________________

Адрес ______________________________
(почтовый индекс и подробный адрес)

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Кассир Всего ______

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Кассир Всего ______

ЦІКАВА

# АЛЬПІЙСКАЯ БАЛАДА

Іван БІЧ

**У аўстрыйскай правінцыі Цiроль закончыўся год святкавання 200-й гадавіны паўстання Андрэаса Гофера. Свята стала падставай для экстрэмістаў, каб узняць праблему Паўднёвага Цiролю.**



Год Андрэаса Гофера афіцыйна закончылі святкаваць у мінулыя выходныя. Увогуле, Андрэас Гофер — арганізатар трох паўстанняў супраць французаў і баварцаў у пачатку XIX стагоддзя. Пасля паразы Аўстрыі ў вайне з Напалеонам цірольскія землі сталі часткай Баварыі. Новыя ўлады пачалі зямельную і царкоўную рэформы. Гэта і выклікала бунт, які, дарэчы, праходзіў пад клерыкальнымі і кансерватыўнымі лозунгамі. Так, Гофер забараніў жанчынам насіць папулярныя па ўсёй Еўропе фасоны адзення, якія ён палічыў занадта эпатажнымі. На тэрыторыях, захопленых паўстанцамі, былі забароненыя балы і танцы. Так ці інакш, паўстанне доўжылася дастаткова доўга, пакуль французы нарэшце не злавілі і не закатавалі яго лідэра.

Пра Андрэаса Гофера, аднак, не забылі. Ён стаў нацыянальным героем — падчас святкавання ў на вуліцах Інсбруку (сталіца Цiроля) сто тысяч чалавек выйшлі, каб згадаць ягоны чын. Сярод прысутных на свяце былі такія важныя персоны, як федэральны прэзідэнт і прэм'ер.

Аднак не ўсё было так мірна. З самага пачатку святкавання года Гофера стала зразумела, што мерапрыемствы будуць выкарыстаны радыкаламі, каб узняць пытанне Паўднёвага Цiролю. Праблема ўзнікла ў 1919 годзе. У той час Паўднёвы Цiроль паводле дамовы, падпісанай у Сэн-Жэрмене (Францыя), адышоў Італіі.

Ужо тады інкарпарацыя рэгіёну ў склад Італіі выклікала шмат пратэстаў. Па-сутнасці, такі крок супярэчыў 14-ці пунктам амерыканскага прэзідэнта Вудра Вільсана, на базе якіх мусіў будавацца свет пасля першай сусветнай вайны. Адзін з галоўных пунктаў праграмы гарантаваў нацыям права на самавызначэнне. У выпадку Цiроля парушэнне гэтага правіла было відавочным. 89 працэнтаў цірольцаў былі аўстрыйцамі.

У той час у Германіі і Аўстрыі назіралася цікавая форма салідарнасці з цірольцамі. Кожны горад называў якую-небудзь плошчу Плацам Паўднёвага Цiролю.

Натуральна, для італьянскіх фашыстаў Паўднёвы Цiроль стаў аб'ектам нянавісці. У 1922 годзе прыкладна 700 сяброў баявых фашысцкіх атрадаў адправіліся туды, каб давесці, што Паўднёвы Цiроль — гэта частка Італіі.

Пазней Рым пачаў палітыку «італізацыі». Імёны цірольцаў былі перапісаныя на італьянскі манер. Нават сама назва «Цiроль» была забаронена. Цяпер гэта правінцыя называлася Боцэн. Пазней у рамках асіміляцыі была забаронена і нямецкая мова. У адказ узніклі падпольныя класы.

У 1928 годзе пачалася новая фаза каланізацыі. Мусаліні стварыў тут нешта кшталту Свабоднай эканамічнай зоны. Прадпрымальнікі, якія жадалі інвеставаць у мясцовую гаспадарку, атрымалі вялікія бонусы. Наступствам стала вялікае перасяленне італьянцаў. Так, насельніцтва сталіцы Боцэна вырасла ў 1930-я гады ў чатыры разы.

Пасля прыходу да ўлады Гітлера, які называў сябе фюрэрам усіх немцаў (сюды ён запісаў і аўстрыйцаў), сітуацыя стала папросту камічнай. З аднаго боку, Берлін вымагаў абароны правоў сваіх землякоў, аднак з другога — сварыцца з саюзнікам Мусаліні ён не хацеў. У 1939 годзе было падпісана італьянска-нямецкае пагадненне. Адпаведна яму, цірольцы павінны былі або пераехаць жыць у Рэйх, або застацца ў краі і прыняць італьянскае грамадзянства, або пераехаць у нямецкія калоніі ў розных гарадах Італіі. Пазней падчас вайны з СССР іх нават думалі адправіць у Крым. Усяго ў той час пакінулі радзіму 75 тысяч чалавек.

Расчараванне палітыкай Гітлера прывяло да таго, што ў краі нават узнікала сапраўднае антыфашысцкае падполле. Яго актывісты, аб'яднаныя ў Саюз Андрэаса Гофера, вымагалі аднаўлення Аўстрыі, у склад якой павінен быў увайсці таксама Паўднёвы Цiроль. Група мела кантакты з брытанскай разведкай.

Канец вайны выклікаў у цірольцаў надзею на вяртанне ў склад Аўстрыі. Аднак краіна была падзелена паміж саюзнікамі на 4 акупацыйных зоны.



Паўднёвы Цiроль застаўся італьянскім.

Супраціў працягваўся. У 1957 годзе назіраліся пратэсты супраць намеру ўраду перасяліць у Цiроль 5 тысяч працоўных з Паўднёвай Італіі. Немагчымасць дабіцца аўтаноміі палітычнымі сродкамі прывяла да з'яўлення тэрарыстычнага руху. Быў створаны Камітэт вызвалення Паўднёвага Цiролю (BAS). Групоўка галоўным чынам займалася разбурэннем помнікаў фашызму 1920–1930-х гадоў, праводзіла дыверсіі. Увогуле, з пачатку 1950-х італьянскія карабінеры зафіксавалі 361 акт тэрору з боку цірольскіх сепаратыстаў.



Між тым, паступова Аўстрыя і Італія дасягнулі кампрамісу па праблеме. Пасля афіцыйнай адмовы Вены ад прэтэнзій да Італіі, Рым пачаў рэформы. З 1972 года Паўднёвы Цiроль — аўтаномія, дзе нямецкая і італьянская мовы маюць роўны статус. Існуе прынцып нацыянальнага прапарцыйнага прадстаўніцтва ў дзяржаўных інстытутах (раней 90 працэнтаў чыноўнікаў былі італьянцамі).

Аднак напярэдадні згаданага вышэй святкавання ў Інсбруку выбухнуў скандал. Паўднёвыя цірольцы, дакладней, некаторыя іх арганізацыі, заявілі, што адмовяцца ад удзелу ў святах, калі ім забароняць пранос цярновага вянку, які павінен сімвалізаваць смутак па падзеях 1919 года. Ультыматум актывізаваў усе неанацысцкія арганізацыі Аўстрыі і Германіі.

У выніку вянок несці дазволілі, аднак ён быў афармлены ў мадэрновым стылі. Аднак правакацый усё роўна хапала. Там-сям можна было пабачыць транспаранты «Паўднёвы Цiроль — не Італія». Прычым на гэтыя раз былі заўважаныя лозунгі таксама і супраць Аўстрыі. «Наша радзіма — Аб'яднаны Цiроль», — скандавалі нейкія радыкалы.

Аднак, здаецца, цягнік ужо сышоў. У Паўднёвым Цiролі цяпер толькі кожны чацвёрты — італьянец. Але пры гэтым 40 працэнтаў насельніцтва выступаюць за тое, каб край заставаўся ў складзе Італіі. За аб'яднанне з Паўночным Цiролем у складзе Аўстрыі выступаюць 27 працэнтаў цірольцаў.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

У беларускім спісе крыўдаў значацца так і не атрыманы ад РФ другі транш крэдыту ў 500 мільёнаў і «малочная вайна» ў чэрвені. У сваю чаргу, Масква можа згадаць Лукашэнку адмову прызнаць Абхазію і Паўднёвую Асецію, а таксама прагуляны ў тым жа чэрвені маскоўскі саміт Арганізацыі дамовы калектыўнай бяспекі (АДКБ), на якім не быў падпісаны дакумент пра стварэнне калектыўных сіл аператыўнага рэагавання. Мінск таксама адмовіўся прымаць старшынства ў АДКБ. Акрамя таго, Расіі не падабаецца збліжэнне Беларусі і ЕС у рамках праграмы «Усходняе партнёрства». Як паказвае папярэдняя практыка сустрэч Дзмітрыя Мядзведзева і Аляксандра Лукашэнкі, пасля кожнага спаткання спіс прэтэнзій Беларусі і Масквы толькі расце. Пакуль усё сведчыць на карысць таго, што цяперашнія перамовы ў Баранавічах не будуць выключэннем.

**«Коммерсантъ» (Расія)**

Аднак, нягледзячы на супярэчнасці, ёсць і тое, што збліжае пазіцыі абедзвюх краін, у першую чаргу пазіцыю Беларусі. Гэта патрэба ў расійскіх крэдытах. Спробы Лукашэнкі атрымаць крэдыты ад Захаду пакуль малапаспяховыя. Кіраўніцтва МВФ яшчэ напрыканцы лета крытычна пракаментавала такія ўчынкі беларускага ўраду, як «нерэнтабельнае выкарыстанне атрыманых сродкаў і штучную падтрымку высокага курсу беларускай валюты». Падзенне курсу мясцовай валюты, у сваю чаргу, радыкальна зменіць ступень даверу беларусаў да свайго Бацькі, таму на гэта Лукашэнка пайсці не можа. У выніку крэдыт памерам у 2,1 мільярда долараў, які чакае Мінск ад МВФ, стаіць пад пытаннем. У гэтых умовах нават прадстаўнік МВФ у краіне Наталля Каляда прызнае, што «Беларусі будзе цяжка абысціся без расійскіх крэдытаў». Вось толькі Расія вуснамі свайго міністра фінансаў Аляксея Кудрына яшчэ з лета выказвае заклапочанасць наконт таго, як Беларусь будзе вяртаць рускія крэдыты.

**Zarusskiy.org (Расія)**

Пасля мінулага літоўска-беларускага эканамічнага форума, куды ўласна і быў запрошаны прэзідэнт Беларусі, стала больш чым відавочна, хто сёння рэальна кіруе ў Літве. Да сталых ужо штодзённых разваг пра ролю ў жыцці і палітыцы набліжаных да ўлады алігархаў у Расіі і на Украіне цалкам можна дадаць і Літву. Гучную заяву зрабіў на гэтым форуме літоўскі алігарх Уладзімір Раманаў, які прызнаўся, што аддае перавагу дыктатуры лукашэнкаўскага кшталту. Гэта можа служыць яркім доказам наяўнасці ў палітыцы эфектыўнага лобі буйнога літоўскага бізнесу. Апалагеты маральнай палітыкі, некаторыя з якіх спадзяваліся, што ўбачаць хоць кветкі ад Лукашэнкі, які прайшоў праз мяжу літаральна побач з крыжамі мемарыялу Медзінінкай (на гэтых магілах ляжаць ахвяры падзей 1990–1991 гадоў), пасля такіх заяў алігарха проста адпачываюць.

**«Delfi» (Літва)**

Еўракамісія не спяшаецца разглядаць праекты, якія падрыхтаваў беларускі бок. Зараз праекты абмяркоўваюцца з суседнімі краінамі — Латвіяй, Украінай, Літвой, Польшчай. А што да Беларусі, Еўракамісія тым часам кажа, нібыта яна «выпрацоўвае механізмы абмеркавання праектаў». Пакуль паміж Беларуссю і ЕС захоўваецца канфлікт. Гаворка ідзе пра прапанову Еўрапарламента ўключыць у склад беларускай парламенцкай дэлегацыі ў ПАСЕ прадстаўнікоў апазіцыі, гэтаму ўлады Беларусі «люта супярэчаць».

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ



### ЧЭХІЯ. РЭАБІЛІТАВАЦЬ ЯНА ГУСА

Візіт Папы Рымскага ў Чэхію быў азмрочаны незвычайнымі пратэстамі. Уздоўж маршрута руху картэжу Папы віселі транспаранты з тэкстам кшталту «Рэабілітаваць Яна Гуса!». Мова пра таго самага славутага дзеяча чэшскага нацыянальнага адраджэння і рэфармацыі. 6 ліпеня 1415 года Ян Гус, які адмовіўся адрачыся ад сваіх «памылак», паводле прысуду сабора каталіцкіх біскупаў быў спалены. Гэты інцыдэнт у выніку справакаваў пачатак так званых гусіцкіх войнаў. Да гэтага часу каталіцкая царква не рэабілітавала Гуса. Нягледзячы на тое, што ў Чэхіі большасць вернікаў — каталікі, Гус традыцыйна карыстаецца павагай як барацьбіт за нацыянальную самабытнасць. Акрамя таго, у 1918 годзе паўстала Чэхаславацкая гусіцкая царква, якая мае на сённяшні дзень каля 100 000 прыхільнікаў і падтрымлівае экуменічныя адносіны з Каталіцкай царквой. Часам, праўда, яна ўступае з Рымам у спрэчкі з-за таго, што прызнае права жанчын быць біскупамі. Цікава, што да вернікаў згаданай царквы гусітаў належыць і цяперашні прэзідэнт Вацлаў Клаус.

**Па матэрыялах чэшскай і польскай прэсы**

### СЕРБІЯ. АТАКА ГОПНІКАЎ

Сербская сталіца яшчэ такога не бачыла. Цэнтр Бялграда атакуюць маладыя хуліганы з акраін, якія шукаюць прадстаўнікоў сексуальных меншасцяў. 26 верасня ў гадавіну прыняцця Еўрасаюзам у 2000 годзе рэзалюцыі ў абароны іх правоў, гомасексуалісты і лесбіянкі традыцыйна арганізуюць якія-небудзь святочныя імпрэзы. Гэтым разам сербскія сексменшасці хацелі правесці гей-парад, аднак улады ім адмовілі. Тым не менш ксенафобскі настроеная моладзь вырашыла перастрахавацца і не дапусціць вылазак аматараў нетрадыцыйнага сексу. Іх ахвотна падтрымалі правыя экстрэмісцкія групоўкі. Ахвярамі гэтага сталі інтурысты. Не вельмі добра разумеючы асаблівасці культуры сексуальных меншасцяў, гопнікі запісалі туды ўсіх, хто не падобны на сербаў, маўляў, гаворыш на іншай мове — значыць, не натурал. Напады на іншаземцаў у цэнтры сербскай сталіцы набылі такі маштаб, што МЗС краіны быў вымушаны выступіць са спецыяльнай заявай. Між тым, адзін француз, ахвяра гамафобаў, знаходзіцца ў стане комы.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**



### ТАДЖЫКІСТАН. ВАЙНА ЗА ЗНЕШНІ ВЫГЛЯД

У Партыю ісламскага адраджэння Таджыкістана паступіла заява ад дванаццаці вучаніц агульнаадукацыйных школ. Дзяўчыны скардзяцца на тое, што адміністрацыі школ забараняюць ім пераступаць школьны парог у мусульманскіх хустках «русары». Такім чынам, на думку кіраўнікоў партыі, адміністрацыі школ парушаюць, у прыватнасці, артыкул 41 Канстытуцыі Таджыкістана, які гарантуе кожнаму грамадзяніну рэспублікі безумоўнае права на атрыманне адукацыі. Са свайго боку, начальнік Упраўлення адукацыі Сагдыйскай вобласці Саідмухтар Джалолаў заявіў: «Калі дзяўчыны прыходзяць у школу ў нацыянальным адзенні, часткай якога з'яўляюцца звычайныя хусткі, то ім гэтага ніхто забароніць. Аднак мы павінны адрозніваць іх ад «русары». Нацыянальныя хусткі адрозніваюцца ад «русары» тым, што не закрываюць усе забароненыя для чужога позірку часткі цела (аўрат). Паводле ісламскіх патрабаванняў, аўрат у жанчын — усё цела, акрамя твару і далоняў. Валасы на галаве ў жанчыны таксама адносяць да аўрат, таму яны павінны быць схаваныя. Цікава, што дзяржава даўно вядзе кампанію за правільны знешні выгляд. Школьнікаў і студэнтаў Таджыкістана абавязалі апранаць гальштукі і строгія гарнітуры, дзяўчынам забаранілі прыходзіць на заняткі ў нагавіцах, міні-спадніцах, яны павінны трымацца стандарту «белы верх, чорны ніз» ці хадзіць у нацыянальных таджыкскіх сукенках, адмовіцца ад макіяжу. Абмежаванні тычацца не толькі знешняга выгляду навучэнцаў. Нагадаем, што не так даўно прэзідэнт Таджыкістана забараніў школьнікам і студэнтам мець пры сабе мабільныя тэлефоны, нават калі яны выключаныя, дабірацца да навучальнай установы на асабістым аўтамабілі, праводзіць выпускныя балі. А Міністэрства адукацыі Таджыкістана вырашыла пайсці далей і рыхтуе дакумент, які рэгулюе форму адзення школьных выкладчыкаў.

**Па матэрыялах таджыкскай прэсы**

**ВЫБАРЫ**

# ВЫБІРАЦЬ ЦІ ЗАБАРАНЯЦЬ

*Алег ПЯТРОЎ*

**Правыя радыкальныя партыі прайгралі выбары ў Бундэстаг, аднак нямецкая грамадскасць патрабуе іх поўнай забароны.**



Правыя радыкалы ўвайшлі ў парламент яшчэ аднаго нямецкага рэгіёна — зямлі Мекленбург Пярэдняя Памеранія

Правыя радыкалы, прадстаўленыя ў Германіі Нацыянал-дэмакратычнай партыяй (NDP), Народным саюзам (DU), рэспубліканцамі і Народнай ініцыятывай, выступілі, на першы погляд, вельмі слаба. Ні адна з партый не наблізілася да пяці працэнтаў, што гарантуюць праходжанне ў парламент. Увогуле, найлепшы паказчык неанацысцкіх партый на федэральных выбарах у нацыянал-дэмакратаў — 4,7 (1969 год). А ў 1989-м за рэспубліканцаў на выбарах у Еўрапарламент аддалі галасы 7 працэнтаў немцаў.

Аднак разглядаць неанацыстаў як статыстаў на апошніх выбарах было б няправільна. На хвалі крызісу даверу да старых партый у атмасферы нестабільнасці, выкліканай глабальнай рэцэсіяй, нацыяналістычныя пасланні сталі знаходзяць свайго адрасата.

Ілюстрацыя зменаў настрояў — феномен зямлі Саксонія, якую правыя за апошнія дзесяць гадоў ператварылі ў свой электаральны бастыён. У мясцовым зямельным парламенце ўжо другі раз прысутнічае фракцыя NDP. Гэта, дарэчы, гістарычны прэцэдэнт. Камунальныя выбары вясной гэтага года паказалі, што нацыянал-дэмакраты маюць сваю сацыяльную базу на месцах. У сярэднім у кожнай камуне за іх галасавала 5,6 працэнта. У Дрэздэне нават дзейнічае нацысцкі аналітычны цэнтр, так званая Дрэздэнская школа.

Поспех на апошніх зямельных выбарах у Саксоніі (жнівень 2009 года) выклікаў не толькі фурор сярод актыву NDP, але і жаданне перанесці саксонскую мадэль выбарчых кампаній на федэральны ўзровень.

Самі саксонцы поспех тлумачылі тым, што арыентуюцца на больш шырокія колы грамадства, далёкія ад лозунгаў адраджэння Трэцяга Рэйху і праблемаў расавай чысціні. На першае месца выходзяць сацыяльныя пытанні. «Праца — сям'я — радзіма!» — такім быў лозунг саксонскіх нацыянал-дэмакратаў на апошніх выбарах. Важная складовая кампаніі — персанальная крытыка праціўніка, а не партыі. Уся кампанія была накіравана супраць главы адміністрацыі.

Дарэчы, такі падыход выклікаў крытыку з боку лідэра NDP Уда Войгта. Ён прапанаваў сваю канцэпцыю кампаніі пад назвай «Нямецкі шлях». Намер за кошт сацыяльнага папулізму замацавацца ў больш шырокіх сацыяльных групах ён назваў «апартунізмам». На яго думку, у



правых радыкалаў павінна быць выключна нацыянал-кансерватыўная лінія. На самай справе, нацыянал-дэмакраты ніколі не думалі цалкам адмаўляцца ад кантактаў са скінхедамі. Па падліках паліцыі, яны падтрымліваюць актыўныя кантакты са ста дзесяцю так званымі Freie Kameradenschaten (Вольнымі таварыствамі) — лакальнымі групоўкамі скінхедаў, аматарамі нацысцкага року і г.д.

Так ці інакш, менавіта прыёмы саксонцаў былі ўжытыя NDP на апошніх федэральных выбарах. Кампанія нацыянал-дэмакратаў праходзіла пад лозунгам «Працоўныя месцы для немцаў». «Смяротнае пакаранне для забойцаў дзяцей», «Радзіма! Родная мова! Шчасце дзіцяці!» Тэма нацыяналізму, расізму прысутнічала ў выбарчых буклетах, аднак у абмежаваным выглядзе.

Увогуле, неанацысты прызнавалі, што прарвацца ў Бундэстаг яны наўрад ці змогуць. Галоўная стаўка рабілася на выбары ў парламент зямлі Брандэнбург. Гэта частка былой ГДР, для якой характэрныя высокі ўзровень беспрацоўя, сацыяльная дэзінтэграцыя, палітычная апатыя.

Выбары 28 верасня прадэманстравалі, што Брандэнбург стаў сімвалам перамогі не правых, а левых. Тут з трыумфам перамаглі сацыял-дэмакраты. Нацыянал-дэмакраты ледзь набралі два працэнта.

Аднак пагроза прыходу неанацыстаў у вялікую палітыку застаецца вельмі актуальнай. Як дэманструюць вынікі выбараў, разам ультраправыя маглі б мець як мінімум 4 працэнты.

Тут, на думку спецыялістаў, у чарговы раз дапамагла супярэчлівая прырода аматараў Трэцяга Рэйху, занадта вялікія амбіцыі іх лідэраў, адсутнасць кампрамісу ў тактычных пытаннях. Напярэдадні выбараў у Бундэстаг раскалоўся так званы «Нямецкі пакт» — альянс нацыянал-дэмакратаў і народнікаў. Прычынай стала чарговая спрэчка правадыроў. Аналітыкі кажуць, што ў выпадку саюзу правых яны мелі б шанс паспрабаваць узяць пяціпрацэнтны бар'ер у Брандэнбургу.

Таксама выклікаюць занепакоенасць так званыя U–18 Wahl — выбары сярод тых, каму няма 18-ці гадоў. Звычайна напярэдадні федэральных многія школы арганізуюць свае сімвалічныя выбары. Пасля падводзяцца вынікі галасавання па ўсёй краіне. Партыі вельмі ўважліва ставяцца да U–18 Wahl, паколькі галасуюць на іх тыя, хто праз пару гадоў стане сапраўдным выбаршчыкам. У гэтым годзе нацыянал-дэмакраты атрымалі сярод дзяцей 4,6 працэнта. Адным з самых «карычневых» рэгіёнаў стаў Брандэнбург, дзе NDP набрала 7 працэнтаў.

Між тым, хутка нацыянал-дэмакратам можа быць не да выбараў. У сакавіку Аддзел абароны канстытуцыі апублікаваў даклад, зроблены на аснове дадзеных інфарматараў, якія тайна працуюць у партыі. Калі верыць дакладу, кіраўнікі нацыянал-дэмакратаў на прыватных сустрэчах мэтай сваёй дзейнасці лічаць падтрымку правага вулічнага экстрэмізму і нацыяналістычнай варожасці. Іх лаяльнасць закону і канстытуцыі — выключна гульня на публіку. Даклад выклікаў палеміку наконт забароны нацыянал-дэмакратаў. Цяпер амаль кожная партыя вядзе дыскусію пра гэта. Аднак старт працэсу забароны NDP можа даць выключна міністр унутраных спраў, імя якога будзе вядома пасля заканчэння фармавання новай урадавай кааліцыі хрысціянскіх дэмакратаў і лібералаў.

З НАГОДЫ

# ШТО РАБІЦЬ З РАМАНАМ ПАЛАНСКІ?

Іван БІЧ

**Тэма, якую зараз найчасцей абмяркоўваюць у чатах і інтэрнэт-форумах краін СНД, — справа Рамана Паланскі. Дзякуючы гэтай палеміцы можна зрабіць пэўныя высновы пра стан духоўнасці, прававой культуры, маралі нашага грамадства. Прапануем невялікую падборку каментараў карыстальнікаў сеціва з розных краін СНД.**



**Для даведкі:**



Славуты рэжысёр Раман Паланскі — лаўрэат шматлікіх прэмій — быў арыштаваны ў Швейцарыі ў суботу 26 верасня па запыце амерыканскіх уладаў. У 1978 годзе ў ЗША ён быў прызнаны вінаватым у згвалтаванні 13-гадовай дзяўчынкі Саманты Геймер у доме акцёра Джэка Нікалсана. Аднак на гэты час рэжысёр ужо збег у Еўропу, хаця абвінавачанне прызнаў. На мінулым тыдні яго арыштавалі падчас візіту ў Швейцарыю. Цяпер Рамана Паланскі чакае экстрадыцыі ў ЗША. Між тым, урады краін ЕС і многія славутыя акцёры і рэжысёры патрабуюць вызвалення Паланскі.

«Шмат хто здзіўляецца маёй жорсткай пазіцыі — злачынца павінен сядзець у турме. Я лічу, што згвалтаванне маленькага чалавека трэба разглядаць як забойства. Паколькі адбываецца забойства чалавечай душы. І не істотна, калі гэта адбылося — 32 гады таму або 106. Шмат хто піша, што Паланскі вельмі старэнькі, яму 76 гадоў. Так мы дагаворымся да поўнай лухты — 90-гадовых фашысцкіх злачынцаў пачнём прабачаць і выпускаць на волю. Калі чалавек зрабіў злачынства, ён павінен быць пакараны, кім бы ён ні быў па прафесіі — палітык, рэжысёр, шафёр. Закон для ўсіх павінен быць аднолькавы».

«Маральны крызіс — гэта калі рэжысёра-педафіла: А) не пасадзяць пад ціскам грамадскасці і такім чынам створаць прэцэдэнт — калі ты педафіл, аднак вядомы і таленавіты, то наперад, рабі, што захочаш; Б) пасадзяць, і ёнператворыцца ў пакутніка, ахвяру артадаксальных законаў Дзікага Захаду, якія безумоўна трэба мяняць».

«Вакол ідуць размовы пра тое, што Паланскі ў сваім жыцці нацярпеўся, што 13-гадовую дзяўчынку можна было і дараваць. Тым больш, што наш стары — геній. Усё гэта цудоўна, аднак хіба вы б прабачылі генія, які спакусіў вашу дачку?»

«Людзям, якія маюць уяўленне пра індустрыю моды і яе эпіфеномены, усё зразумела, калі ім гавораць: дзяўчынка, якую згвалціў Паланскі, была фотамадэллю. І ёй было толькі 13 гадоў. Фотамадэль. Гэта слова мяняе ўсё карэнным чынам».

«Спрэчка вакол Паланскі — гэта супрацьстаянне Амерыкі і Еўропы. Апошняя дробязна помсціць Еўропе. Помсціць культуралагічна. Мы ўсе ведаем, што Амерыка ахоплена комплексам непаўнавартаснасці. Водападзел вечны».

«Маразм шырыцца і становіцца больш моцным. Папросту няма слоў. Камусьці зноў патрэбна праслаўіцца ў чарговым крыжовым паходзе і распачаць паляванне на ведзьмаў. Няўжо больш няма ніякіх праблем, якія трэба сапраўды абмяркоўваць і вырашаць. Не! Вось трэба ўзняць хвалю супраць старога рэжысёра і яго ахвяры — маці сямейства, якой далёка за 40. Дарэчы, яна просіць прыпыніць увесь гэты маразм і пакінуць у спакоі яе сям'ю і Паланскі. Але зноў — не. Войскі дабра і справядлівасці ідуць наперад праз лёсы людзей у імя светлых ідэяў чалавецтва. Справа закончылася 30 гадоў таму!»

«Дзяўчына падманула яго наконт свайго ўзросту (выглядала яна, дарэчы, на ўсе 16), напілася шампанскага, накурылася траўкі. Ды не ўтрымаўся, падонак. Што вы хацелі ад паляка. Тэмперамент падвёў. Ну, блін, давайце яго кастрыруем у 76 гадоў. А лепш адразу расстраляем. Не, лепш спачатку расстраляем, а потым кастрыруем. Няма слоў».

«Дарэчы, нават зэкі такіх злачынцаў у турме караюць. Аказваецца, што нашы зэкі больш справядлівыя, чым грамадства. Яны не робяць папраўкі на тое, што «магчыма, дзяўчынка сама спакусіла яго».

«Паланскі абараняюць усе нармальныя людзі ў Еўропе. Рэжысёры, пісьменнікі, палітыкі і г.д. (я не маю на ўвазе Расію, дзе яго ўсе дружна ненавідзяць). Ніхто не апраўдвае тое, што ён зрабіў. Яго абараняюць ад дзіўных паводзінаў амерыканскай Феміды, якая запатрабавала яго выдачы праз 32 гады пасля таго, што ён нарабіў. Пры гэтым сама ахвяра Паланскі даўно патрабуе прыпыніць яго пераслед. Кожны чалавек, незалежна ад таго, што ён зрабіў, мае права на абарону ад учынкаў, якія здаюцца непрапарцыйнымі».

«А дзе былі бацькі 13-гадовага дзіцяці, якая знаходзілася ўначы на кватэры ў кампаніі 40-гадовых мужыкоў, якія абкурыліся, на чужой кватэры?»

«Думаю, што над Паланскі трэба зрабіць паказальны судовы працэс. Даць яму гадоў 60 турмы ў лепшых традыцыях барацьбы з педафіламі. Трэба прадэманстраваць, што за секс з дзецьмі няма тэрміну даўніны. Ператварыць яго ў монстра. Фільмы забараніць».

«Па-сутнасці, Рома сам вінаваты. Стаў на шлях барацьбы з амерыканскім судом. Трэба было папросту наняць шмат добрых юрыстаў і абаронцаў».

«Ніхто не мае маральнага права называць асобу педафілам, забойцам і г. д., пакуль гэта не ўстанавіў суд. У дадзеным выпадку судовыя слуханні яшчэ не адбыліся».

«Вядома пра тое, што пацярпелая сама просіць не пераследаваць Паланскі ў судовым парадку. Гэта зразумела: нашто жанчыне цягнуць праз усё жыццё шлейф той гісторыі, якую будуць абмяркоўваць усе, каму захочацца. Грамадства абараняе сябе за кошт драмаў асобных людзей?»

«Я даўно не веру ў судовую справядлівасць, аднак думаю, што, магчыма, зноў паверу ў яе, калі педафіла такога рангу кінуць за краты».

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ




### ВОНА

Вона — гэта яе прозвішча, а сапраўднае імя ніхто не ведае. Варыянты — Ларыса або Лідзія. Аднак галоўнае — не прозвішча, а тое, што спадарыня Вона па спецыяльнасці свінарка з Хмяльніцкай вобласці, якая вырашыла балатавацца ў прэзідэнты Украіны. Менавіта такую інфармацыю распаўсюдзіла партыя «Сельская Украіна» на мінулым тыдні. Навіна пра свінарку-кандыдата выклікала вялікую цікавасць СМІ. Аднак чым далей, тым усё больш зразумела, што размовы вядуцца пра нешта цалкам віртуальнае. Так, да гэтага часу ніводны журналіст не змог пабачыць тую заклапочаную палітыкай сялянку. У «Сельской Украине» кажуць, што баяцца за жыццё пані Воны і прапануюць задавальняцца яе партрэтамі ў сеціве. Яе выявы там сапраўды з'явіліся. На іх нейкая жанчына чытае на сене Канстытуцыю Украіны. Пра віртуальнасць кандыдата Воны кажа і той факт, што адзін з лідэраў «Сельскай Украіны» чатыры гады таму быў злоўлены на махлярстве: ён арганізаваў выбарчую кампанію Веркі Сярдзючкі, якая сама пра гэта не ведала. Хутчэй за ўсё, ніякай Воны не існуе, думаюць эксперты. Папросту прайдзісветы ад палітыкі правяраюць, наколькі цікавы праект свінаркі-кандыдата для іншых буйных партый. Апошнія маглі б выкарыстаць Вону ў якасці тэхнічнага кандыдата для таго, каб адцягнуць галасы ад сваіх праціўнікаў. Напрыклад, прозвішча Вона фактычна разбурае выбарчую кампанію Блока Юліі Цімашэнка (БЮТ). Зараз па ўсёй краіне вісяць білборды БЮТ: «Яны спрачаюцца. Яна (укр.: вона) працуе».

### СІЛЬВІА БЕРЛУСКОНІ



Прэм'ер Італіі працягвае шакіраваць грамадскасць не толькі сваімі сексуальнымі прыгодамі, аднак і амбіцыямі. 29 верасня яму споўнілася 73 гады. Менавіта ў гэты дзень адбылася прэзентацыя песні, якая прысвечаная высоўванню Берлусконі на Нобелеўскую прэмію міра. Песня называецца «Свет здольны». Напісаў яе кампазітар, сябра прэм'ера. Яе тэкст праслаўляе ўчынкі палітыка і заканчваецца словамі «Сільвіа — вялікі». Увогуле, імяніннік любіць пець і адначасова праслаўляць сябе ў музычных творах. Так, на апошніх выбарах падчас акцый ягонай партыі актывісты спявалі песню «Нам зноў патрэбны Сільвія». Што тычыцца песні «Свет здольны», то яе выканаў адзін вядомы італьянскі тэнар. Паколькі Сільвіа — уладальнік шматлікіх СМІ, трансляцыі песні «Мір здольны» пачула ўся краіна. Цяжка казаць, як гэты крок адаб'ецца на шансах Берлусконі атрымаць прэмію. Увогуле, калі верыць спецыяльнаму сайту, палітык павінен атрымаць прэмію «за вырашэнне крызісу паміж Грузіяй і Расіяй», а таксама за падпісанне мірнай дамовы паміж Рымам і Трыпалі. На сайце Сільвіа таксама прыпісваюць такія дасягненні, як стварэнне новай эфектыўнай мадэлі эканомікі. На цяперашні дзень кандыдатуру Сільвіа падтрымалі па ўсяму свету 10 тысяч чалавек.

### НІК ГРЫФІН



Лідэр праварадыкальнай Брытанскай нацыянальнай партыі (BNP) вырашыў пачаць кампанію за галасы малых этнасаў Вялікабрытаніі. Дарэчы, BNP — партыя, якая абапіраецца на галасы англічан, выкарыстоўвае англійскую сімволіку і г. д., таму жыхары Шатландыі і Уэльсу, якія маюць аўтаномію, за іх галасуюць не вельмі ахвотна. І вось BNP выпусціла плакат і майкі з партрэтамі Святога Георга (патрон Англіі), Уільяма Уолеса і Овайна Глендура. Два апошніх — героі барацьбы Шатландыі і Уэльсу за незалежнасць супраць Лондану. Пад тройцай прысутнічае надпіс: «Брытанцы па нараджэнню, валійцы і шатландцы дзякуючы Богу». На думку правых радыкалаў, такія плакаты дапамогуць зрабіць брытанскі нацыяналізм мацнейшым. Між тым, лідэры нацыяналістычных партый рэгіёнаў дружна ўзняліся на абарону сваіх гістарычных куміраў. Так, валійцы збіраюцца падаваць на BNP у суд за выкарыстанне выявы Овайна Глендура без згоды мастака, які яго намаляваў. Яны таксама падкрэсліваюць, што Глендур «не быў расістам».

▸ ВІЗІТ

# МІНСКАЯ ВОСЕНЬ ПАТРЫЯРХА

Аляксей ХАДЫКА

**Жнівеньскі 10-дзённы візіт Кірыла ва Украіну і вераснёўскі ў Беларусь адрозныя па характары. Паводле суладных каментараў з Расіі і Украіны, беларускі візіт чакаўся на фоне ўкраінскага як «выдатная магчымасць адпачыць», бо «ніякіх праблем у Беларусі ў Патрыярха не павінна было ўзнікнуць». Але гэтыя візіты сведчаць пра жаданне РПЦ стаць адкрытай навакольнаму свету.**





У Беларусі хоць і дэкларавалася «сустрэча з аднадумцамі», візіт меў некалькі складаных і неадназначных павестак. На іх і будавалася інтрыга. Пералічым. Далейшае развіццё адносін беларускай дзяржавы і праваслаўнай царквы, так бы мовіць, у палітычнай сферы. Сустрэчы з вернікамі. Нарэшце, абмеркаванне — праз выказванні двух бакоў — далёкасяжнага плана Аляксандра Лукашэнкі яго пасярэдніцтва ў экуменічным дыялогу РПЦ і заходняга каталіцкага свету. Плана, ажыццяўленне якога абяцае адпаведныя практычныя дывідэнды ў выбарчым 2011 годзе.

Факталогія патрыяршага візіту вядомая нашым чытачам. Таму не будзем на ёй спыняцца. Тым больш, што на фоне аптымістычных прагнозаў ідылічнага візіту раптам высветлілася, што ў ацэнцы ўзаемаадносін царквы і дзяржавы беларускім прэзідэнтам і маскоўскім патрыярхам ёсць відавочныя адрозненні. І калі першы падчас асабістай сустрэчы 25 верасня падкрэсліў, заігрываючы з расійскай пасляпятроўскай традыцыяй, што «не зусім разумее, як можна такі вялікі інстытут, як царква, аддзяліць ад дзяржавы», то другі расставіў іншыя акцэнты. Ён настойваў на важнасці таго, каб «царква не атаясамлівала сябе з уладай, сілай, магутнасцю». Напэўна, каб Аляксандр Лукашэнка мог дазволіць сабе задаць пытанне наўпрост, ён бы ўдакладніў — не атаясамлівала з чыёй уладай? Бо нефармальная ўбудаванасць РПЦ у структуру сучаснага расійскага палітычнага пейзажа — сакрэт Палішынеля. Ці дарма вынікі папярэдняй сваёй місіі на Украіну Кірыл падрабязна абмяркоўваў з прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым?

Але патрыярх Кірыл, выказаўшыся пра месца, якое ён бачыць для Беларусі ў «праваслаўным свеце», у духу вядомай канцэпцыі кананічных тэрыторый РПЦ, гэта пытанне зняў сам. І новага ў плане геапалітычных і цывілізацыйных пабудоў у тэорыі і практыцы РПЦ у яго словах не прагучала: «Мы з вамі ўтвараем адзінае цывілізацыйнае грамадства: і рускія, і ўкраінцы, і беларусы, і малдаване — усе, хто належыць да адзінай РПЦ». Як быццам не было Кіева і Вільні, як не было імкнення да хрысціянскага яднання на нашай зямлі, што падмацоўвала раз за разам праекты уніі праваслаўных з іншымі хрысціянамі і прывяло да ўзнікнення грэка-каталіцкай царквы. Адзін з велічных храмаў якой, Успенскі сабор у Віцебску, адноўлены як належны РПЦ, і наведаў пазней патрыярх Кірыл.

Зразумела, што тэма адрознай гісторыі хрысціянства ў Беларусі падчас патрыяршага візіту засталася табуяванай. І хаця народ «праваслаўнай краіны Беларусі» жыве на самым заходнім краі Святой Русі, судакранаючыся з «цывілізацыйнай мяжой Еўропы», яна, Беларусь, па словах найвышэйшага іерарха РПЦ, — частка праваслаўнага свету, «ніякі не мост і не шлюз». Таму і накірунак сувязяў, у развіцці якіх патрыярх гатовы спрыяць беларускаму прэзідэнту, не Захад—Усход, як у палітыцы, так і ў экуменічных кантактах пры пасярэдніцтве нашай краіны. Зусім не. «Царква заўжды гатова аказаць падтрымку ўмацаванню, развіццю саюза братэрскіх дзяржаў і аказаць спрыянне ў дыялогу беларускага кіраўніцтва з расійскімі ўладамі», — сцвердзіў патрыярх, сустракаючыся з Аляксандрам Рыгоравічам. Калі РПЦ не атаясамлівае сябе з уладай, то, відавочна, найперш з беларускай. Палітычныя інтарэсы Масквы ёй, зразумела, бліжэйшыя.

Так тэма арганізацыі Лукашэнкам экуменічнай сустрэчы, якая разглядалася беларускім бокам як адна з важнейшых, вылілася ў канфуз. «Я нічога не ведаю пра такія высілкі», — дэкларававаў Кірыл яшчэ падчас сустрэчы ў аэрапорце, адказваючы на пытанні гатовых да ўдакладнення дэталяў інтрыгуючага сюжэта карэспандэнтаў. Ці не таму, закрануты за жывое, Аляксандр Лукашэнка не прысутнічаў на ўрачыстым пасяджэнні ў Палацы Рэспублікі, адразу пасля гутаркі з высокім маскоўскім госцем? А дарэмна. Ён не пачуў асабіста яшчэ аднаго знакавага паслання патрыярха Кірыла: «Сімвалам пакутаў Беларусі з'яўляюцца ўрочышча Курапаты пад Мінскам і вёска Хатынь».

Ці паўплывае гэты эпізод, як і словы Кірыла на сустрэчы з моладдзю ў Віцебску ўжо ў панядзелак («Я цалкам перакананы, што героем краіны не можа быць прагматычны палітык, жорсткі дзеяч ці тыран»), на адносіны беларускіх афіцыйных улад да таталітарнай спадчыны сталінізму? Важкі тэзіс, які б гучаў больш пераканаўча, каб у Курапатах паўстала праваслаўная капліца. А ў якасці нацыянальнага сімвала, «імя Беларусі», у выпадку правядзення апытання, моду на якія ў еўрапейскіх краінах завялі брытанцы, патрыярх на згаданай віцебскай сустрэчы назваў імя святой Ефрасінні Полацкай.

Зразумела, што пры поглядзе з Масквы нашымі сімваламі не бачацца Леў Сапега, Канстанцін Астрожскі ці Кастусь Каліноўскі. Не тую кананічную тэрыторыю яны адбудоўвалі ці не да той канфесіі схіляліся. Добра хоць, што для Расіі ў якасці герояў кіраўнік РПЦ не вылучыў Пятра Першага ці Івана Жахлівага. Упадабанні патрыярха Кірыла задаволіла абраная ў Расіі менш гістарычна спрэчная постаць Аляксандра Неўскага.

Ускосна імкненне «засталбіць» ролю Беларусі і яе кіраўніка ў магчымым міжканфесійным дыялогу адбілася ў «пасляслоўі» да патрыяршага візіту прэзідэнцкага рупара — газеты «СБ». Выданне слова ў слова пераказала інфармацыю з афіцыйнага сайта беларускага касцёла http://catholic.by/ пра сустрэчу мітрапаліта Мінска-Магілёўскага Тадэвуша Кандрусевіча з патрыярхам Кірылам падчас мерапрыемстваў у Палацы Рэспублікі: яны спаткаліся «як старыя знаёмыя, якія добра ведаюць адзін аднаго». Карэспандэнтка «СБ» адзначыла, што іерархі закранулі тэму візіту на папярэднім тыдні ў Ватыкан архіепіскапа Іларыёна, які меў аўдыенцыі ў Папы Бенедыкта XVI і яго атачэння.

Нарэшце, іншае выданне, «КП в Белоруссии», звярнула ўвагу на тое, што Каталіцкае інфармацыйнае агенцтва, абвяшчаючы планы паездак Папы Бенедыкта XVI на 2010 год, апрача трох «узгодненых» візітаў у Вялікабрытанію, Мальту і Германію, падало звесткі пра чацвёрты верагодны — у Партугалію або Беларусь. Ці наспявае сенсацыя? Падобна, яна можа абмежавацца не толькі спробай самастойнай гульні Беларусі на тым полі, дзе яе не жадае бачыць РПЦ. Ужо падчас заканчэння візіту патрыярха ў Беларусь у Маскве прагучаў абсалютна недвухсэнсоўны каментар намесніка старшыні Аддзела знешніх царкоўных сувязяў МП іераманаха Філіпа (Рабых): «Адносіны паміж цэрквамі — пытанне рэлігійнае, якое не патрабуе пасярэдніцтва свецкіх сілаў». За патрыярха адкрытым тэкстам выказалася атачэнне.

Што яшчэ звярнула ўвагу падчас візіту патрыярха Кірыла? Хіба малая колькасць часу, адведзеная малітоўнаму жыццю, — у Мінску ўвогуле не адбылося ніводнай публічнай літургіі з яго ўдзелам. Але падчас выступу Кірыла ў Палацы Рэспублікі тыя, хто сачыў за ім, адзначылі ўменне патрыярха звяртацца і гаварыць на тэмы маральнасці і духоўнасці, апелюючы да беларускіх культурных каштоўнасцяў і знакавых імёнаў. Замест царкоўнай службы адбылася пропаведзь на плошчы. Як у выказванні пра Курапаты, патрыярх перахопліваў у беларускага прэзідэнта ініцыятыву сцвярджэння маральнасці ўлады. Добра падрыхтаваная ў рыторыцы духоўная ўлада перамагала ўладу свецкую.

Цытуючы Багдановіча і Быкава, прыгадваючы служэнне Скарыны царкоўнай асвеце народа, патрыярх казаў пра каштоўнасці самаахвярнасці, ўзаемадапамогі, сумлення, салідарнасці і братэрства, звязваючы іх з беларускай гістарычнай глебай. І дэкларуючы служэнне ім інстытутаў РПЦ. Робячы гэта больш гнутка і пераканаўча, чым пастыры ягонай царквы ў Беларусі. Але ж вельмі лёгка да ўзнёслых слоў дадаваўся знаёмы палітычны хваласпеў накont стасункаў Беларусі і Расіі: «Даражыце гэтым саюзам, створаным у згодзе з народнай воляй, з нашай згодай, які бласлаўляецца Праваслаўнай Царквой!» Дык ці царква па-за палітыкай? Ці ўтульна Беларусі ў сяброўскіх абдымках? Можа, царкве больш выпадае бласлаўляць сяброўства і мір, чым палітычны саюз сумнеўнай раўнавартаснасці? Можа, камусьці пры гэтых словах патрыярха прыгадаўся сумнеўны падарунак, прывезены Барысам Ельцыным у Беларусь напрыканцы 1990 года — «Ахоўную грамату Оршы 1664 года», сведчанне страшнай вайны Масковіі супраць ВКЛ. Ці тое, што сярод «усіх палітыкаў і эліт», да якіх апеляваў патрыярх, прыхільнікаў «саюза» (не блытаць з сяброўствам) з Расіяй можа быць нават менш, чым па звестках чэрвеньскага апытання НІСЭПД, дзе іх 42,1% (41,4% — за ўваходжанне ў ЕС).

Патрыярх звяртаўся як чалавек царкоўны да свецкай аўдыторыі, імкнучыся пераканаць і быць зразумелым. Дэклараваў рух царквы да яе ўмацавання як інстытута маральнасці ў грамадстве. Ці здолее РПЦ пад кіраўніцтвам новага кіраўніка адрадзіцца як носьбіт хрысціянскага гуманізму, перадолеўшы спадчыну пятроўскага дзяржаўнага закабалення царквы і катастрофы савецкіх гадоў, пакажа час. Ці інтарэсы паствы — у Расіі і ў Беларусі — уздымуцца над прыхаванымі за прыгожымі словамі міждзяржаўнымі разлікамі ды карпаратыўнымі інтарэсамі пастыраў? Тады вернікаў не давядзецца склікаць на сустрэчы з пастырам з выкарыстаннем школьных і інстытуцкіх настаўнікаў, як было гэтым разам.

А беларускай уладзе выступ патрыярха Кірыла дае наглядны ўрок. Не столькі гульня за кошт геапалітычных супрацьваг, колькі прыняцце і практычнае выкарыстанне сістэмы станоўчых маральных імператываў — сумленне, салідарнасць, братэрства — дапамогуць ёй усталяваць свой аўтарытэт у грамадстве. І пераадолець крызіс — як эканамічны, так і духоўны.

ФЕСТЫВАЛЬ

# Таня Малярчук: «Я ПІШУ СЦІСЛА І СТРАШНА»

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**23–26 верасня адбыўся чарговы літаратурны фестываль «European Borderlands — Абсягі паэзіі», мэта якога — «звязаць дыялогам некаторыя асабліва цікавыя галасы ў паэзіі і прозе ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе». Кожны год імправізаваная трупа літаратараў наведвае цягам тыдня дзве краіны, звязаныя культурна і гістарычна, але ў сучаснасці падзеленыя межамі. Сёлета Берлінскі літаратурны калёквіум і «Allianz Kulturstiftung» (арганізатары фестывалю) аб'яднालі Беларусь і Літву. Паэты абедзвюх краін, а таксама прадстаўнікі Германіі, Швейцарыі, Польшчы і Украіны выступалі ў Вільні і Мінску.**

Сапраўднай неспадзяванкай для беларускай публікі, якая сабралася 25 і 26 верасня ў Доме дружбы на вуліцы Захарава, стаў удзел у фестывалі ўкраінкі Тані Малярчук. Найперш таму, што сярод усіх выступоўцаў яна была адзіная пісьменніца, а не паэтка. Па-другое, гэта, відаць, самая значная з'ява так званай «новай літаратуры» нашых паўднёвых суседзяў у Мінску пасля колькіразовых выступаў тут Аляксандра Ірванца і Сяргея Жадана.

Таня Малярчук нарадзілася ў Івана-Франкоўску ў 1983 годзе. Дэбютавала ў прозе, калі ёй было 20. Яе першая кніга «Эндшпіль Адольфа, або Ружа для Лізы» (2004) адразу паставіла на вушы самавітых украінскіх крытыкаў і пісьменнікаў старэйшага пакалення. Яе прозу параўноўвалі то з заходнімі Павічам ды Маркесам, то з айчыннымі Прахаськам і Іздрыкам, гаварылі аб прагрэсе ўкраінскага магічнага рэалізму. Пасля таго харкаўскае выдавецтва «Фоліо» надрукавала яшчэ чатыры кнігі прозы Тані: «Згоры ўніз: кніга страхаў» (2006), «Як я стала святой» (2006), «Гаварыць» (2007), «Звераслоў» (2009), ніводная з якіх не змусіла акулаў пяра забраць назад свае кампліменты.

Падчас выступу ў Мінску гэта непасрэдная паненка і сапраўды перакрочыла культурныя межы, зладзіўшы своеасаблівы перформанс. Адмовілася ад паслуг паралельнага перакладу на спецыяльна ўсталяваным экране і сама прачытала сваё апавяданне па-беларуску. «Гэта смелы эксперымент, я ўпершыню ў Мінску і амаль ніколі дагэтуль не чула беларускую мову»… «ЗІрніце», — ставіла яна націск, хіхікаючы сама з сябе. «ЗірнІце», — смеючыся папраўляла зала.

На падворку Дому дружбы мы гутарым з Таняй пра літаратуру яе краіны.

***— Ты паходзіш з Івана-Франкоўску (раней — Станіслаў). Апішы, калі ласка, знутры «станіслаўскі феномен».***

— «Станіслаўскі феномен» даўно памёр, хаця яго з'яўленне было вельмі знамянальным і прыўкрасным, яно дало шмат добрых тэкстаў, кніжак, аўтараў. Раней, у 1990-я, Івана-Франкоўск быў сапраўдным цэнтрам новай літаратуры, але потым з'ява распаўзлася па ўсёй Украіне: Львоў, Харкаў, Кіеў.

Калі ўсё гэта адбывалася, я была маленькай. Зразумела, «феномен» на мяне вельмі паўплываў. Я толькі скончыла школу і паступіла ў Прыкарпацкі універсітэт, на філалогію. У мяне некалькі выкладчыкаў былі пісьменнікамі. Шточацвер адбываліся літаратурныя імпрэзы, я ведала ўсіх пісьменнікаў у твар і страшна гэтым ганарылася. На літаратурныя вечарыны я хадзіла як на лекцыі. Усіх гэтых пісьменнікаў я абагаўляла, узносіла на п'едэстал. Страшна люблю іх дагэтуль.

***— Імёны?***

— Пісьменнікі Юры Андруховіч, Тарас Прахаська, Юрко Іздрык, менш вядомыя цяпер, але вельмі добрыя паэткі Галіна Петрасаняк, Марыя Макіцэй, Ганна Сэрэда. Пісьменнікі Уладзімір Ешкілеў, Юрко Іздрык. Іздрыка можна згадаць і двойчы. Да таго ж, яны пастаянна запрашалі ў госці замежных пісьменнікаў, рабілі часопісы (напрыклад, «Четвер» — Е.В.) вар'яцкія перформансы... Аднойчы, недзе ў канцы 1990-х, вывесілі ў Музеі сакральнага мастацтва фотаздымкі аголеных жанчын. Скандал быў на ўзроўні мэрыі. А! Была яшчэ чароўная кавярня «Пэтэрс», шчыльна звязаная са «станіслаўскім феноменам», можа, яна яго і стварыла — бо менавіта там па чацвяргах усё і адбывалася. Цяпер там аптэка... Хаця, хто ведае, можа цяпер у Івана-Франкоўску аптэка больш патрэбная.

***— Ці не з гэткімі «жыццёвымі універсітэтамі» звязана цытата, што часта фігуруе ў прэсе: «Дзіўна, я такая маладая і такая мудрая»?***

— Божа, не трэба так наўпрост прывязваць гэта да мяне. Так гаворыць мая гераіня, а не я. Я насамрэч старая і дурная. Я думаю, што з самага дзяцінства павялося. А маё літаратурнае кшталтаванне, відаць, было звязанае з тым, што я расла самотніцай, мне ніхто не быў патрэбны, ні з кім не гаварыла, чытала кніжкі па дваццаць на тыдзень.

***— Вельмі рэдкі выпадак, калі такую маладую пісьменніцу, як ты, так ухвальна прымае крытыка. Што важней: любоў крытыкаў ці чытачоў?***

— Я думаю, важней проста любоў. Любоў усіх. Я неяк не дзяліла любові крытыкаў і чытачоў. На крытыку я ўвогуле мала звяртаю ўвагі. Да таго ж, мне здаецца, што



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Таня Малярчук

крытыка ва Украіне не асабліва ёсць. Для добрай крытыкі павінна быць магутная літаратура, разнастайная, разнасферная, сістэмная. У нас такой літаратуры пакуль няма. У нас існуе пласт для інтэлектуалаў, а нізавога і сярэдняга пакуль мала. Папсовых жанраў — дэтэктываў ды жаночых раманаў — па-ўкраінску не пішуць.

***— А як жа ж Марыя Маціос, Ірэна Карпа?***

— Іх усё адно чытаюць адны і тыя ж людзі — умоўна кажучы, «інтэлігенцыя». У метро ж спрэс чытаюць Усцінаву ды Данцову.

Але калі існуе людская патрэба ў такой літаратуры, значыць, яны патрэбныя. Яны запаўняюць пэўную нішу. Шкада, ніхто з імі не можа канкураваць… Але я вось зараз падумала, што па-ўкраінску цяжка напісаць такога кшталту тэкст, таму што мова не прыдатная да такой літаратуры. Найперш таму, што звычайныя людзі мала гавораць па-ўкраінску. Гэта мова інтэлігенцыі. Звычайныя пралетарыі камунікуюць з дапамогай суржыку. Вось такой мовай варта пісаць папсовыя тэксты!

***— У цябе ёсць дзве вялікія «заганы». Як у празаіка. Папершае, ты маладая, па-другое — ты жанчына. Агульнапрынятым стэрэатып: празаік — гэта такі самавіты мужык пасля 30-ці. Як выжыць маладой пісьменніцы ў свеце літаратуры?***

— Я думаю, што трэба проста не думаць пра тое, што жыць цяжка… Усе гэтыя гендэрныя штукі, мне здаецца, крыху адышлі ва Украіне. Мяне гэта вельмі цешыць. Яшчэ некалькі гадоў таму першым пытаннем журналістаў было: «Как вы относитесь к женской литературе?» Я адказвала, што «я к ней не отношусь», я ні феміністка, ні антыфеміністка, не бачце ўва мне жанчыну. Хаця ясна, што жаночае і мужчынскае пісьмо вельмі розняцца… Зусім няцяжка выжываць. Мне, напрыклад, вельмі лёгка. Іншая рэч, што ўкраінская літаратура доўгі час была вельмі маскулінная. Зразумела, былі жанчыны: Леся Украінка, Ліна Кастэнка. Але пра іх казалі, маўляў, гэта ці не першыя мужчыны ва ўкраінскай літаратуры. Іх успрымалі як мужчынападобных істот — яны і мыслілі так. Мне здаецца, жаночая літаратура ў сённяшняй Украіне вельмі актуальная. То бок, паўстала жаданне і неабходнасць выслаўляцца па-жаночаму. І гэта вельмі добра ўспрымаецца.

> **УДЗЕЛЬНІКІ ФЕСТЫВАЛЮ «EUROPEAN BORDERLANDS — АБСЯГІ ПАЭЗІІ»:**
>
> Эўгеніюс Алішанка, Уладас Бразюнас, Гінтарас Граяўскас, Дайва Чапаўскайце, Агне Жагракаліце (Літва)
>
> Уладзімір Арлоў, Вера Бурлак, Вольга Гапеева, Дзмітры Дзмітрыеў, Андрэй Хадановіч (Беларусь)
>
> Тадэвуш Дамброўскі (Польшча)
>
> Таня Малярчук (Украіна)
>
> Ільма Ракуза (Швейцарыя)
>
> Ян Вагнэр, Марсэль Байер (Германія)

***— Праз сваю мегазнакамітасць ты ўваходзіш у шэраг «экспартных» украінскіх пісьменнікаў, што пацвярджае ў тым ліку і тваё з'яўленне тут. У Беларусі выезд пісьменніка за мяжу на творчыя стыпендыі часта расцэньваецца як здрада Радзіме. Як у гэтым плане выглядаюць твае стасункі з тэмай Айчыны?***

— Родная краіна вельмі добра бачыцца збоку. Развітанне з радзімай дае вялізнае натхненне. Натхненне, змяшанае з настальгіяй. Сваю першую кнігу я напісала ў Сібіры, калі тры месяцы гасцявала ў цёткі. «Нарадзіла» літаральна за два тыдні, дагэтуль нічога не пісаўшы. Яшчэ я была тры месяцы ў Кракаве, на стыпендыі Homines Urbani. Там я таксама напісала кнігу. Падчас такіх стыпендый у цябе шмат часу. Табе плацяць грошы ні за што, ты там сядзіш, і табе няма чаго рабіць. Калі пісьменніку няма чаго рабіць, ён можа або бухаць, або пісаць. Бухаць увесь час нельга... Але тут справа ў іншым. Прадстаўляць краіну за мяжой — гэта пачэсна і адказна. Аднак ёсць вельмі шмат людзей, нават не зайздросніках — ніядах нейкіх. Яны б самі хацелі на нейкія стыпендыі, і таму ім здаецца, што ўсе, хто туды паехаў, зрабілі гэта вельмі несумленнымі шляхамі, з дапамогай карупцыі нейкай. Што на справе далёка не так. Але дзе б я ні была, я б ніколі не рызыкнула пісаць пра іншую краіну. Для мяне Украіна ёсць чымсьці адзіна літаратурным. Я толькі пра яе магу пісаць.

***— З пісьменніцтва ва Украіне можна жыць?***

— Я чатыры гады так жыла, нідзе не працуючы. Зразумела, што журналістыкай займацца не магу, бо не ўяўляю, што такое аб'ектыўнасць, надта люблю прыбрэхваць, прычым раблю гэта так, нібы большай праўды ў свеце не існуе, сама сябе абдурваю. Але з крызісам я была змушана зноў пайсці ў тэлежурналістыку; змагаюся з сабой. Але нават самыя вялікія пісьменнікі не могуць увесь час жыць з творчасці, бо для гэтага трэба выдаваць кніжку ў год, а такі тэмп не кожны вытрымліваць можа. Але не трэба думаць, што пісьменніцтва ўвогуле павінна прыносіць грошы. Яно прыносіць пэўны стыль, спосаб жыцця. Да грошай я стаўлюся вельмі легкаважна. Яны прыходзяць і сыходзяць.

***— Пісьменнік для поспеху павінен напісаць раман. Закон рынку.***

— Я не рынкавая і некамерцыйная ўвогуле, бо я гэтага не разумею. Журналісты пастаянна пішуць, маўляў, усё чакаюць ад мяне рамана, а я не разумею, хто канкрэтна чакае ад мяне рамана. Пакажыце мне гэтага чалавека! Я яшчэ няздольная напісаць раман. Некалькі разоў спрабавала, але на трыццатай старонцы разумела, што ўсё. Ёсць такая фраза ва ўкраінскай літаратуры: «Ён пісаў сцісла і страшна». Дык вось, я пішу сцісла і страшна. Можа, праз некалькі гадоў штосьці атрымаецца. Нешта накшталт альтэрнатыўнага гістарычнага рамана.

***— Ты нарадзілася ў Івана-Франкоўску, жывеш у Кіеве, а выдаешся ў Харкаве. Як ты гэта ў сабе сумяшчаеш?***

— Усё неяк само сабой выйшла. Выпадкова нарадзілася ў Івана-Франкоўску. Выпадкова ўцякла ў Кіеў з невялікім заплечнікам, куды змясцілася ўсё маё папярэдняе жыццё. А харкаўскае «Фоліо» — самае буйное выдавецтва ў краіне. Прапанавалі — выдалася. Неяк так.

***— Кавярня «Пэтэрс» сфармавала «станіслаўскі феномен». А дзе вы тусуецеся ў Кіеве?***

— У Кіеве такога месца няма, на жаль. Там няма зацішных кавярняў, якіх багата ў Львове, напрыклад. Раней быў невялічкі калялітаратурны паб у цэнтры — «Купідон»... Але і там стала паршыва.. Мне вельмі падабаецца рог вуліц Пушкінскай і Прарызной: гастраномчык, пры ім некалькі столікаў, там традыцыйна збіраліся савецкія пісьменнікі выпіць па стопачцы, пагаварыць пра літаратуру... Дагэтуль бачу там нейкіх невядомых мне пажылых дзеячаў культуры, якія паседжваюць там, п'юць каву з каньячком... Мне даецца, гэта вельмі міла і сентыментальна... Кіеў жыве сваім жыццём, я яго не ведаю.

НАТАТКІ

# АЎТАSTOPАМ ПА ЕЎРОПАМ

## АЎТАДАВЕДКА

Я — аспірант-культуролаг, працую экскурсаводам. Вандрую са студэнцкіх часоў, аўтаспынам і не толькі. Больш падабаецца ездзіць на Захад і Поўнач.

Гэтыя аўтаспынныя нататкі я зрабіў пасля падарожжа па Польшчы, Літве, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі, Расіі ў жніўні гэтага года. Фінансавай дапамогай была гітара: гранне на вуліцах у старых гарадах, бывае, прыносіць пэўны прыбытак.

Мэта падарожжа — убачыць, як жывуць іншыя народы. Я думаю, турфірмы не могуць даць магчымасці ўбачыць іншую краіну ў такім выглядзе. Турыстам заўжды імкнуцца паказаць самае лепшае, а часам нават — несапраўднае, штучнае.

Іншая справа — аўтаспын: вадзіцель, які вас падбірае, ужо дазваляе вам увайсці ў свой свет. Ён, звычайны жыхар гэтай краіны, можа паведаміць вам пра свае маленькія праблемы, выкажа свае погляды на палітыку, эканоміку, культуру.

І ў гэтым ёсць свая праўда, простая і маленькая. І калі вам пашчасціць мець некалькі такіх размоваў, то малюнак краіны стане больш дакладным. А часам вадзіцель запросіць вас на начлег, і тады культура гэтага краю вам адкрыецца знутры, а яшчэ вы зразумееце, што значыць чалавечая адкрытасць.

У такіх падарожжаў няўмысна параўноўваеш жыццё замежнікаў з нашым і знаходзіш шмат агульнага, а штосьці, наадварот, здзіўляе. Прыгоды, нечаканыя знаёмствы, «падарункі лёсу» і шматгадзінныя «завісоны» (калі проста не бяруць) — усяго гэтага багата ў аўтаспынным падарожжы. А яшчэ гэта танна.

Таму, аднойчы пачаўшы, ніяк не магу спыніцца спыняць. І самае дзіўнае — спыняюцца!

**Раман АБРАМЧУК**

## Удалы спын да Варшавы

Раніца. Выезд на брэсцкую шашу. Неверагодна ўдалы спын да Варшавы. Мяне падбірае рускі Андрэй, які едзе ў Германію забіраць сваю жонку з лякарні. Разам будзем у дарозе каля 8 гадзінаў, разам перажывем пераезд праз мяжу. Ён аказаўся бізнесменам, які валодае кардоннай вытворчасцю і даволі няблага жыве. Аб'ехаў літаральна ўсе краіны Заходняй Еўропы. Здзіўляе сваёй павагай да палітычнай пазіцыі прыбалтыйскіх народаў і просіць мяне размаўляць па-беларуску. Прайшоўшы разам усе колы пакутаў беларуска-польскай мяжы, выскокваем на дарогу да Варшавы. Я кажу Андрэю, што ў палякаў ёсць такое традыцыйнае пажаданне вадзіцелю: «шырокай дарогі», бо здавён тут робяць вузкія дарогі. Андрэй задаволена паўтарае польскі выраз і… ледзь не «ўпісваецца» ў задні бампер фуры. Будзе памятаць выслоўе да канца дзён.

Ужо а 17-й шпацырую па Варшаве. Польшча заўжды пагружала мяне ў дэпрэсію. Калі бачыш мноства захаваных гістарычных помнікаў, узровень патрыятызму, іх імкненне дапамагчы, падказаць штосьці незнаёмцу, — пачынаеш разумець нашу беднасць на гэта ўсё. У Польшчы гэтага з лішкам, у нас — драбніцы, якія трэба яшчэ абараняць.

Таксама ў дэпрэсію заганяе багацце грамадства на рэалізаваныя ініцыятывы. Здаецца, любы чалавек, які задумаў штосьці — ці то ў бізнесе, ці то ў культуры, грамадскай дзейнасці, — мае магчымасць рэалізаваць сваю ідэю. Папросту зайздросна.

## «U2» прызямліўся ў Польшчы

Адна з мэтаў майго падарожжа — канцэрт «U2» у Хожаве (Катавіцы).



Фота аўтара



Фота аўтара

Перад канцэртам «U2». На першым плане аўтаспыншчык Раман Абрамчук

З Вавы (так скарочана называюць сваю сталіцу палякі) да Катовіцаў (агламерацыя з некалькіх гарадоў) — каля трох гадзін дарогі. Выязджаю раней. Але ўжо з цэнтра ў бок маёй трасы цягнуцца групкі па 10–30 чалавек з харугвамі і спевамі: стартуе знакамітая штогадовая польская пілігрымка ў Чэнстахова. Спыняць абсалютна немагчыма: ланцуг паломнікаў расцягнуты ўздоўж патрэбнай мне для спыну абочыны на доўгія-доўгія кіламетра-гадзіны. Уклінваюся ў шэрагі адной з моладзевых груп. Урэшце ўся працэсія збочвае на абед: мой шанец злавіць машыну. Ды вось яны ўжо і мільгацяць — легкавушкі з надпісам «U2» пад шклом: палякі любяць выяўляць сябе праз такія «фішкі».

Пад стадыёнам я каля 14-й. Тут ужо тусуецца мноства чакаючых. Усе яны — розных узростаў, напрамкаў, стыляў. Размаўляюць на розных мовах. Іх аб'ядноўвае толькі прыхільнасць да гурта.

Увогуле, прыезд «U2» у Польшчу — знакавая падзея. Палякі сапраўды любяць гэты гурт. І калі пераязджаеш беларуска-польскую мяжу, то адразу заўважаецца — па FM-станцыях нязвыкла часта гучыць Бона. А ірландцы любяць Польшчу. Гэта самы ўсходні куток Еўропы, куды ўжо другі раз завітвае сусветна вядомая ірландская чацвёрка, ды і сам Бона прызнаваўся, што тут найбольш цёплая публіка. У варшаўскім штодзённіку «Metro» навіна пра канцэрт — на першай паласе, а ўнутры — артыкул: «Бона: музыка, палітык, святы».

Канцэрт пачынаецца а 19-й гадзіне. Сустракаю дзяўчыну з Мінску, таксама фанатку «U2». Хто мне патлумачыць, як такое адбываецца?

Сцэнічныя эксперыменты «U2» называюць найбольш перадавымі ў свеце. Вялізарны экран кальцом размешчаны пад дышлам «каракаціцы» (такой мне спачатку падалася сцэна). Ды яшчэ і расцягваецца ўніз. Дрыжыкі бягуць па спіне, калі па ім паўзуць відэашэрагі з электранічным музычным фонам.

## «Пароль» для беларусаў

Паміж песнямі Бона выступае з прамовамі. Пра мір, праблемы ў арабскім рэгіёне і Польшчу: «Еўропе патрэбна болей такіх нацый, як палякі. Што аб'ядноўвае Польшчу з Ірландыяй? Вера? Вера ў будучае? Вера ў тое, што будучае будзе лепш, чым мінулае, і не толькі для некаторых, а для многіх».

Пяць гадоў таму на канцэрце «U2» польскія фаны зрабілі белымі і чырвонымі майкамі і заплечнікамі польскі сцяг на стадыёне. Уражаныя ірландцы тады паабяцалі прыехаць яшчэ раз, калі такое паўтарыцца, і зрабіць відэаролік. На гэты раз бела-чырвоны сцяг з маек зноў лунаў над стадыёнам.

Адну з песень Бона перафразаваў спецыяльна для палякаў: «Your know your name. Password. Enter now. Your know your name — Solidarity». Так, палякі дабіліся ўсяго дзякуючы «Салідарнасці» і праз салідарнасць. Доўгае ўпартае змаганне за лепшае жыццё, за прасвятленне ў грамадстве. Салідарнасць — гэта тое, што ім трэба было прыдбаць, чаму трэба было навучыцца, каб справіцца з тагачаснай праблемай. І яны далі рады.

Ці ёсць гэты «пароль» у беларусаў? Што нам трэба прыдбаць, каб мы пайшлі ўгару, не ў марах, не ў літаратурных творах і выказваннях, а насамрэч? Каб самым усходнім кутком Еўропы, куды прыехала ірландская чацвёрка была не Польшча, а Беларусь?

Канцэрт пакідае цудоўнае ўражанне. Мноства думак, пачуццяў. Думаеш, наколькі ўсё ж такі пашчасціла ірландцам, што ў іх ёсць «U2». Праславілі сваю краіну на ўвесь свет, неаднаразова былі лепшым гуртом у свеце ў самых розных намінацыях. Стварылі цэлы сусвет сваімі песнямі, цэлы стыль і кірунак.

## «Польска А» і «Польска Б»

Далей шлях ляжыць да Кракава: еду ў госці да сяброўкі. Дапамагае знаёмы з Катавіцаў, у якога я ночыў, сам аўтаспыншчык, ён з педантычнай дакладнасцю малюе маршрут-схему да кальцавой з дапамогай аўтобусаў. Але да Кракава вядзе аўтабан. Гэта значыць, гуляць пешшу, выбіраючы добрае месца для спыну, там забаронена. Ратуе тое, што польскія аўтабаны — новаўвядзенне, і паліцыя не кранае такіх, як я.

Дайшоўшы да запраўкі, падыходжу да маладзёна нефармальнага выгляду (у такім кшталце спыну варта выбіраць, да каго падыходзіць) і прашу ўзяць мяне да Кракава. Позірк «зверху ўніз» дае зразумець, што знешнасць можа падманваць. Спыняючы машыны, ніколі не хочаш нарвацца на тых, хто не разумее аўтаспыннага «віду спорту» і будзе задаваць непрыстойныя пытанні пра вашае фінансавае становішча. «Так, аўтаспынам! Бо ў вас шалёныя кошты на транспарт, бо гэта класна, і ўвогуле, бярэш ці не?!» Канешне, размова выглядала крыху іначай. Праз паўтары гадзіны я непадалёк ад помніка Міцкевічу ў самым цэнтры Кракава. Мая сяброўка грэецца на сонейку ля п'едэстала.

У Кракаве я патрапіў у старую камяніцу. Уражвае, наколькі раскошна жылі крокусы-гараджане. Але вось і першае, што спыняе бязмежнае захапленне польскім дабрабытам: дзяўчыну-сірату высяляюць з гэтай кватэры, бо з'явілася колішняя даваенная гаспадыня, прадставіла даваенныя дакументы на набыццё кватэры і выйграла суд. Справа ў тым, што пасля вайны сацыялістычная ўлада кватэру перадала рабочай сям'і. Дзяўчынка — гэта ўнучка першых пасляваенных гаспадароў. Шчыра кажучы, абурыла сама сітуацыя.

Сяброўка з Кракава падзялілася кліпамі гурта ў стылі «дыскапола». Гэта фолк, з дыска-аранжыроўкамі. Уся Беласточчына адрываецца менавіта пад гэта. Праўда, у астатняй Польшчы гэта лічыцца поўным «адстоем». Ёсць «Польска А» — ад Вроцлава да Варшавы, і «Польска Б» — тое, што калісьці звалася Беларуссю. Усё, што паходзіць з «Польскі Б», мае там статус «калгаснага». Але менавіта беларускія карані, нежаданне іх губляць і ўтвараюць такую непрыглядную на думку «палякаў А», але вельмі самабытную культуру Беластока і ваколіц.

* * *

Зноў Варшава. Здзіўляе мноства турыстаў і раскаваная атмасфера ў Старым Мясце. У горадзе — святкаванне чарговай гадавіны Арміі Краёвай. Зноў уражвае ўзровень патрыятызму: на вуліцах — тэатралізаваныя прадстаўленні на гэту тэму, спяванне тагачасных вайсковых песень, якія падхопліваюць турысты і самі варшавякі, мноства лампадак каля памятных знакаў у горадзе. Жывое ўшанаванне памяці сваіх герояў, без загаду зверху.

**Працяг будзе**

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 2.10.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.